ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# Рэха БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

№ 1 ЖНІВЕНЬ 2008

У НУМАРЫ:

ПАЎСТАННЕ 1863-1864 гг. Стар. 1,3,5,6,7

НАША ГЕРАЛЬДЫКА Стар. 9,10-11

а. Б. ПАЧОПКА І БАБРОВІЧЫ Стар. 12-13

ПІНШЧЫНА АНТЫСАВЕЦКАЯ Стар. 16-17



Кастусь Каліноўскі

# КАСІНЕРЫ СВАБОДЫ

***Да 170-годдзя ад нараджэння К.Каліноўскага***
***Да 145-годдзя ад пачатку вызваленчага паўстання***

***2 лютага 1838 года ў в. Мастаўляны Гродзенскага павета ў шляхецкай сям'і нарадзіўся Кастусь Каліноўскі, якому наканавана было стаць змагаром за вызваленне нашай Бацькаўшчыны. Дадзены артыкул ёсць спробай уводнага асвятлення падзей паўстання на тэрыторыі сучаснай Івацэвіччыны-Косаўшчыны-Пружаншчыны-Бярозаўшчыны і іншых суседніх рэгіёнаў.***

**ПОСТАЦЬ ГЕРОЯ**

Кастусь вучыўся ў Свіслацкім павятовым вучылішчы, у 1861 годзе скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Там ён пазнаёміўся з рэвалюцыйнымі ідэямі рускіх дэмакратаў. Пэўны час Кастусь узначальваў студэнцкую зямляцкую арганізацыю ў Пецярбургу. Вяртанне ў 1861 годзе на Радзіму супала з насяваннем тут рэвалюцыйнай сітуацыі, калі сяляне былі незадаволеныя ўмовамі аграрнай рэформы. Таму ўвесну 1863 года Кастусь Каліноўскі прыступае да стварэння Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі.

У 1862 – 1863 гадах пад псеўданімам "Яська-гаспадар з-пад Вільні" малады рэвалюцыянер выдае 7 нумароў газеты "Мужыцкая праўда" на беларускай мове. Выхад у свет кожнага нумара газеты даводзіў да шаленства мясцовыя імперскія ўлады. На вышук аўтараў і выдаўцоў былі кінуты значныя паліцэйскія сілы. Аднак, спыніць распаўсюджванне "возмутительных листков" не ўдавалася.

Кожны нумар "Мужыцкай праўды" прысвячаўся нейкай асобнай тэме. Напрыклад, рэкруцкай павіннасці ці абароне Уніяцкай Царквы, якая магла б стаць нацыянальнай царквой беларусаў, тым самым пазбавіўшы іх ад рэлігійнага ўплыву Польшчы і Расіі. Газета выкрывала злоўжыванні расійскіх чыноўнікаў, антынародную палітыку царскага ўрада. Гэтак, "Мужыцкая праўда" №4 распавядала сялянам, якім павінен быць добры ўрад: "І як добры слуга глядзіць жывёлы гаспадарскай і слухае свайго гаспадара, так добры ўрад глядзець павінен шчасця людзей, слухаць народу і рабіць так, як народу лепей. І не дзіва, бо не народ зроблены для ўраду, а ўрад для народу".

22 кастрычніка 1862 года Кастусь Каліноўскі быў прызначаны старшынём Літоўскага правінцыйнага камітэта (ЛПК), які павінен быў кіраваць паўстаннем на землях Літвы-Беларусі.

**ПАЧАТАК ПАЎСТАННЯ**

1 лютага 1863 г. ЛПК выдаў да жыхароў Беларусі Маніфест аб паўстанні. Да гэтага, у студзені, антырасійскае паўстанне ўспыхнула ў Польшчы.

У сакавіку 1863 года ў Беларусі пачынаецца стварэнне мясцовых паўстанцкіх аддзелаў, у якія ўваходзілі шляхта, чыноўнікі, студэнты, сяляне. Наша Івацэвіччына-Косаўшчына-Пружаншчына-Бярозаўшчына была месцам канцэнтрацыі паўстанцкіх аддзелаў. Тут дзейнічалі аб'яднаны Слонімскі аддзел Ф.Юндзіла, пружанскі—Ф.Улодэка, ваўкавыскі—Млотака, наваградскі—В.Міладоўскага і іншыя. (*працяг на стар.3*)



Паўстанцы выходзяць з Гародні на зборны пункт

# Калонка рэдактара



Шаноўнае спадарства!

Мэтамі выдання бюлетэню "Рэха Берасцейшчыны" з'яўляюцца: папулярызацыя гісторыка-культурнай, краязнаўчай спадчыны Берасцейшчыны, выхаванне патрыятызму і любові да роднага Краю, вывучэнне асаблівасцей рэгіёну ў кантэксце агульнаеўрапейскай гісторыі і інш. Акрамя таго, дзякуючы бюлетэню з'явілася яшчэ адна магчымасць данясення ідэй нашых краязнаўцаў да чытача. У асноўным, аўтарамі артыкулаў з'яўляюцца настаўнікі, энтузіясты, аматары даследавання сваёй мясцовасці.

Першы нумар "Рэха Берасцейшчыны" прысвечаны 145-м угодкам нацыянальна-вызваленчага паўстання пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага, у якім актыўны ўдзел прымалі і жыхары нашага рэгіёну.

Акрамя таго, нашая газета асвятляе і многія іншыя пытанні гісторыка-краязнаўчага, культуралагічнага характару.

Зразумела, што праца па выданні бюлетэню была б немагчымай без спрыяння краязнаўцаў, арганізацый і іншых зацікаўленых асобаў. Таму мы выказваем шчырую падзяку ўсім, хто дапамагаў у гэтай справе. Гэта і сайт www.nastaunik.info, і рэдакцыя "Газеты для вас" (Івацэвічы), і бюлетэнь "Дзедзіч" (Берасце), і Грамадскае Аб'яднанне "Гісторыка", і ГА "Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў "Трэці сектар" (Горадня). Дзякуем таксама Берасцейскай абласной філіі Партыі БНФ і асабіста яе кіраўніку Дзмітрыю Шыманскаму.

Але найбольшай падзякі заслугоўваюць нашыя аўтары, улюбёныя ў Родны Край постаці, якія ствараюць арэол велічнасці мінулага Бацькаўшчыны. Сярод іх настаўнік, краязнавец з Заполля Івацэвіцкага раёна Аляксандр Зайка, аспірант Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Алег Карповіч, выкладчык Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Віталь Гарматны, настаўніца гісторыі з г. Пружаны Наталля Пракаповіч, грэка-каталіцкі святар з Горадні а. Андрэй Крот. Сваімі вершамі з намі падзяліўся студэнт-гуманітарый Яўген Грыцкевіч.

Будзем спадзявацца, што ў будучыні "Рэха Берасцейшчыны" стане рэгулярнай газетай. Таму запрашаем да супрацы як сталых аўтараў-краязнаўцаў, так і пачаткоўцаў. Будзем чакаць вашых артыкулаў.

**Зробім нашую газету разам!**

*Павел ДАЙЛІД,*
*E-mail:dajlid@mail.ru*

# АРХЕАЛАГІЧНАЯ ГАРБАТА

## Знаходкі XIX стагоддзя ў палацы Пуслоўскіх ва ўрочышчы Марачоўшчына

**Ва ўрочышчы Марачоўшчына (Івацэвіцкі раён) у знакамітым палацы Пуслоўскіх вядуцца археалагічныя раскопкі. Імі займаюцца студэнты гістарычнага факультэта Берасцейскага дзяржаўнага ўніверсітэта на чале з вядучым супрацоўнікам па археалогіі "Брэстрэстаўрацыяпраекта", кандыдатам гістарычных навук Аляксандрам Аляксандравічам Башковым.**



**- Аляксандр Аляксандравіч, вы ўжо тыдзень працуеце ў Косаўскім палацы. Гэта вашая ўласная ініцыятыва, ці вас запрасіла арганізацыя, што займаецца рэстаўрацыяй дадзенага аб'екта?**

Дадзены аб'ект уключаны ў рэспубліканскую і абласную праграму па захаванні і рэстаўрацыі архітэктурных гістарычных помнікаў. Таму афіцыйна гэты аб'ект замацаваны за Брэстрэстаўрацыяй. Я тут працую як прадстаўнік філіі Брэстрэстаўрацыі – Брэстрэстаўрацыяпраект. Справа ў тым, што любая дакументацыя праектная ўключае ў сябе комплекснае вывучэнне помнікаў. А гэта значыць, што археалагічныя даследаванні перад рэстаўрацыйнымі працамі абавязковыя. Таму мы праводзім тут археалагічныя назіранні за землянымі працамі, якія адбываюцца ўсярэдзіне гэтага палаца.

**- Што цікавага Вы спадзяецеся знайсці?**

У любым выпадку наша археалагічная праца заўсёды мяжуе з пэўнымі адкрыццямі, таму што немагчыма нешта капаць, каб нічога не знаходзіць. З улікам таго, што тут ніколі не праводзіліся археалагічныя даследаванні, знаходкі тут будуць добрымі ў навуковым плане, у першую чаргу, гэта артэфакты, звязаныя з матэрыяльнай культурай XIX – пачатку XX стагоддзя. І ўжо першыя ёсць у нас добрыя матэрыялы і я думаю, што яны будуць яшчэ накапліваццa і паляпшацца.

**- А ці можна канкрэтызаваць, якія гэта матэрыялы?**

Знойдзены некалькі артэфактаў, звязаных з побытам XIX стагоддзя, у прыватнасці, гэта сталовыя прыборы, нават са срэбра. Таксама ёсць некалькі знаходак, звязаных з інтэр'ерам палаца, гэта вырабы ювелірнага мастацтва, медны падсвечнік, некалькі элементаў кандэлябраў, якія ў той час асвятлялі палац. Шмат вельмі знойдзена кафлі – рэшткі разваленых печак і камінаў. Яны самі па сабе надта унікальныя, бо ніхто не мае зараз дакладных дакументальных звестак пра інтэр'ер гэтага палаца. Легендаў шмат, а рэалій няма. Таму нашыя раскопкі закліканыя да таго, каб сабраць максімальна гэтыя рэшткі, для таго, каб потым у нейкай ступені ўзнавіць унутраны выгляд палаца. Напрыклад, кафля дасць магчымасць узнавіць каміны і я думаю, што яны будуць уключаны ў праектную дакументацыю па рэстаўрацыі палаца. Значыць, гэтыя каміны будуць узноўленыя.

*Павел ДАЙЛІД,*
*Івацэвічы*

*(заканчэнне на стар. 4)*



# КАСІНЕРЫ СВАБОДЫ

***Да 170-годдзя з дня нараджэння К.Каліноўскага***
***Да 145-годдзя ад пачатку вызваленчага паўстання 1863—1864 гг.***

(*працяг, пачатак на стар. 1*)



**РАМАН РАГІНСКІ**

Яшчэ да лютага на тэрыторыю Беларусі пачалі пранікаць першыя паўстанцкія аддзелы з Польшчы. Адным з іх быў аддзел Рамана Рагінскага. Ужо 12 лютага ён, аб'яднаўшыся з атрадам С.Сангіна і Б.Рыльскага авалодаў мястэчкам Шарашова, дзе яны вельмі прыхільна былі сустрэтыя мясцовымі жыхарамі. Тут Р.Рагінскі набыў адзенне і абутак для сваіх паўстанцаў, а таксама 6 пудоў пораху. 13 лютага 1863 г. на досвітку паўстанцы без усялякага супраціўлення захапілі павятовы горад Пружаны. Тут, у горадзе яны знайшлі каля 200 карабінаў, у казначэйстве забралі 10 тыс. рублёў і з Пружан рушылі углыб Палесся, маючы намер узняць на паўстанне мясцовых сялян.

25-26 лютага каля вёскі Боркі (сёння Ганцавіцкі р-н) паўстанцы Рагінскага сутыкнуліся з атрадам царскіх карнікаў пад камандаваннем Альбертава, які складаўся з трох рот пяхоты і сотні казакоў. Са звыклай адвагай Рагінскі пайшоў на няроўны бой і быў разбіты.

3 сакавіка 1863 года Рагінскага злавілі каля Турава ў маёнтку шляхціца Млынскага. Ён быў арыштаваны і дастаўлены ў Берасце, а затым у варшаўскую вязніцу.

Дарэчы, калі Рагінскага прывезлі ў Берасце на апазнанне, то ў горад былі ўведзеныя дадатковыя войскі, каб прадухіліць магчымыя хваляванні.

**ФРАНЦІШАК ЮНДЗІЛ**

У падрыхтоўцы паўстання і яго правядзенні актыўна ўдзельнічаў Ф.Юндзіл, уладальнік маёнтка Югалін. К.Каліноўскі даручыў яму весці падрыхтоўку паўстання ў Слонімскім павеце. Са сваіх грошай Ф.Юндзіл здаў у касу паўстання 3000 рублёў срэбрам. Калі пачалося паўстанне, Ф.Юндзіл стварыў атрад, які дзейнічаў у раёне Дабромысля і Югаліна.

20 мая 1863 г. ў атрадзе Ф.Юндзіла з інспекцыяй пабываў Кастусь Каліноўскі. Атрад Юндзіла прымаў удзел у бітве з расійскімі карнікамі каля Мілавідаў. Пасля паражэння паўстання Ф. Юндзіл эміграваў у Францыю, дзе і памёр у лютым 1865 г.

**ФЕЛІКС УЛОДЭК**

У Пружанскім павеце дзеяннямі атрада касінераў кіраваў шляхціц Фелікс Улодэк (ён жа Самуха, Здзяхоўскі), які меў маёнткі Кабакі ў Пружанскім павеце і Матыкалы ў Берасцейскім (пасля падаўлення паўстання яны былі канфіскаваныя).

Гэты атрад сфарміраваўся 20 красавіка 1863 года “каля карчмы Пінак Пружанскага павета”. Неўзабаве ён налічваў каля 300 чалавек. Атрад дзейнічаў на тэрыторыі сённяшніх Пружанскага, Бярозаўскага, Іванаўскага раёнаў, удзельнічаў у бітве пад Мілавідамі (сёння Баранавіцкі раён) 22 мая 1863 года.

Адтуль паўстанцы Улодэка накіраваліся ў в. Пескі цяперашняга Бярозаўскага раёна, дзе 30 мая за некалькі кіламетраў ад Чорнага возера адбыўся бой з царскімі войскамі. Пасля гэтага атрад Улодэка адыйшоў у Пінскі павет.

**ПАЎСТАНЦКІ МАНІФЕСТ**

“17 мая ў 8 гадзін на дванаццаці паштовых тройках прыбылі ў вёску Любішчыцы ўзброеныя інсургенты (паўстанцы). Яны пачалі званіць, разаслалі конных збіраць па вёсках сялянаў у царкву...” Такія словы рукою мясцовага святара былі запісаныя ў царкоўнай кнізе. Далей там адзначалася, што пасля таго, як сяляне сабраліся ў царкве, быў зачытаны дэкрэт паўстанцкага нацыянальнага ўрада аб надзяленні сялянаў зямлёй і ўраўнанні іх у правах са шляхтай.

Начальнік штаба карных войскаў у Гарадзенскай губерні пісаў: "Каля вёскі Мілавід у маі сяляне цэлымі станамі бралі прысягу на вернасць мяцяжу". І сапраўды, у канцы мая 1863 года кіраўнік паўстанцкага атрада, заняўшы в. Дабромысль, сабраным у царкве членам воласці абвесціў маніфест паўстанцкага ўраду. Аб'яву гэтую зрабіў ён разам з тутэйшым праваслаўным святаром Хрыневічам. Затым сяляне пакляліся быць адданымі нацыянальнаму ўраду. Пад рашэннем падпісаліся начальнік слонімскага паўстанцкага аддзелу І. Лукашэвіч, старшыня воласці Ян Лазарчук і сяляне Зміtрук Шачэла і Тамаш Каневеха.

**МІЛАВІДЫ**

Да канца мая ў лясах блізу Мілавід былі згуртаваныя каля тысячы паўстанцаў пад агульным кіраўніцтвам палкоўніка Ляндэра (Аляксандра Лянкевіча).

22 мая адбылася бітва пад Мілавідамі. Супраць лагера паўстанцаў, узброеных стрэльбамі, пісталетамі і косамі, была выстаўлена рэгулярная армія карнікаў у складзе трох рот Стараінгерманландскага палка, артылерыі і казакоў. Камандаваў карнай аперацыяй палкоўнік А. Чартоў.

Паўстанцы нанеслі праціўніку неспадзяванае для яго паражэнне. Карнікі ж падбіралі забітых і параненых. У выніку, пасля бітвы Чартоў прасіў падмацавання і значна пераўвялічваў сілы паўстанцаў.



**ШЫБЕЛЬНАЯ ГАРА**

Непадалёк ад Івацэвічаў, па дарозе на Косава знаходзіцца памятная мясціна, звязаная з паўстаннем — Шыбельная гара. Тут, у лесе, пасля паражэння паўстання царскія карнікі павесілі 20 інсургентаў. Тут жа яны былі і пахаваныя. У памяць пра іх на гэтым месцы ў другой палове 1990-ых гадоў быў устаноўлены і асвячаны крыж.

**ВЕШАЛЬНІК**

А расійскую палітыку ў дачыненні да нашага краю трапна акрэсліў галоўны душыцель паўстання, віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў: «Забудьте наивные мечтания, занимавшие вас доселе, господа, и помните, что если вы не станете здесь по своим мыслям и чувствам русскими, то вы будете здесь иностранцами и должны тогда покинуть этот край».



Мураўёў-Вешальнік. Карыкатура другой паловы XIX ст.

У 1898 годзе царскаму сатрапу М. Мураўёву, якога ўжо тады называлі “Вешальнік” быў пастаўлены помнік у Вільні. У тым жа годзе і з’явілася вось гэтая вядомая карыкатура з подпісам: “Извергу рода человеческого ВЕШАТЕЛЮ-МУРАВЬЕВУ признательная Литва”.

***Павел ДАЙЛІД,***
***Івацэвічы,***
***гісторык, публіцыст***

# АРХЕАЛАГІЧНАЯ ГАРБАТА

## Знаходкі XIX стагоддзя ў палацы Пуслоўскіх ва ўрочышчы Марачоўшчына

*(працяг, пачатак на стар. 2)*

**- Ці моцна быў парушаны пласт "чорнымі капальнікамі"?**

Атрымалася так, што пасля таго, як палац згарэў, усе перакрыцці і ўсе рэшткі інтэр'еру зваліліся ўсярэдзіну, а пасля былі проста занесены смеццем, пяском. Таму калі "чорныя капальнікі" і знаходзілі тут нешта, то гэта былі выпадковыя знаходкі. Тым больш, што дах палаца быў ацынкаваны металам, таму металашукальнікі, вельмі папулярныя сёння сярод "чорных археолагаў", тут проста гудуць у любым месцы. Таму тут проста трэба сістэматычна капаць, перабіраць зямлю, каб нешта знайсці.

**- Якія Вы бачыце перспектывы ў аднаўленні палаца Пуслоўскіх для Івацэвіччыны, Берасцейшчыны і ў цэлым для Беларусі?**

Тое, што у дзяржавы ёсць сродкі і жаданне аднаўляць такія помнікі – гэта плюс не толькі да аўтарытэту дзяржавы, але і для аўтарытэту нашай культуры беларускай. Аднаўленне гэтых здабыткаў культурных у любым выпадку будзе ўздзейнічаць на духоўны стан нашага грамадства, якое стане ў рэшце рэшт ганарыцца тым, што мы маем. І гэтая рэспубліканская праграма прадугледжвае зараз рэстаўрацыю некалькіх помнікаў. Па Берасцейшчыне ў нас тут ідзе палац Пуслоўскіх у Косаве, а пасля палац Сапегаў у Ружанах і на перспектыву – кляштар картузіянаў у Бярозе. Таму будзем працаваць на гэтых трох аб'ектах, якія важныя для Берасцейшчыны, як самыя значныя, самыя вядомыя. Ну а для рэспублікі зразумела, што ў нас большасць такіх помнікаў размешчана на захадзе Беларусі. І калі на Гродзеншчыне, Міншчыне ў нас ёсць Мірскі і Лідскі замкі, Нясвіжскі палац Радзівілаў, то на Берасцейшчыне будуць Косава, Ружаны і Бяроза. Па вялікаму рахунку, гэта будуць добрыя турыстычныя пункты і я думаю, акрамя таго, што наша дзяржава ў свой час канстатавала неабходнасць пашырэння турызму, то ўжо будзе што і паказаць. А для Косава і Івацэвічаў гэта азначае, што турыстычныя маршруты пралягуць праз гэтыя гарады што паспрыяе развіццю інфраструктуры ў гэтай мясцовасці, а гэта і новыя рабочыя месцы, і сэрвіс, і гандаль.

**- На Вашую думку, якім чынам можна будзе выкарыстоўваць адрэстаўраваны палац у Косаве?**

Ужо ёсць пэўныя планы па адаптацыі гэтага памяшкання. Тут плануюцца гасцінічныя пакоі, рэстарацыя, кафетэрый... Па сутнасці, гэта будзе такі культурна-турыстычны цэнтр, сюды можна будзе прыехаць адпачыць, азнаёміцца з гісторыяй края. Я думаю, што нашыя археалагічныя матэрыялы, якія мы тут знайшлі і знойдзем пойдуць у нейкія выставачныя галерэі. Гэта будзе добры турыстычны комплекс, тым больш, што тут сядзіба Т. Касцюшкі побач.

**- Над чым Вы працавалі да раскопак у Косаве?**

Тры гады мы працавалі ў Воўчыне па даследаванню маёнтка Чартарыйскіх і Панятоўскіх, у гэтым годзе мы ўжо працавалі з Брэстрэстаўрацыяпраектам у в. Заказель Драгічынскага раёна, дзе вывучалі капліцу-усыпальню рода Ажэшкаў і яшчэ ў нас археалагічныя назіранні за землянымі работамі ў горадзе Брэсце, бо будаўніцтва вядзецца ў гістарычнай частцы горада. У прынцыпе, кожны аб'ект, які будзе рэстаўравацца ў Брэсцкай вобласці будзе ўзяты пад нашую апеку. Таму перспектывы вялікія і працы вельмі шмат.

**- Раскажыце пра рэаліі сённяшняй беларускай археалогіі.**

На сенняшні дзень усе сілы акадэмічнай археалогіі скіраваныя на тое, каб паставіць пад кантроль усе земляныя працы падчас будаўніцтва на аховнай, гістарычнай зоне. Акадэмія навук падключае ўсіх археолагаў для кантролю за землянымі працамі. Гэтая тэндэнцыя ўжо шырока распаўсюджана ў Еўропе, але мы ў гэтым плане ідзем ужо на той жа шлях. Існуе сёння імкненне вывесці археалогію з рамкаў чыста навукова-тэарэтычных да практычных. Гэтая тэндэнцыя рухаецца і ў нас на Берасцейшчыне, шмат у чым дзякуючы адміністрацыі Брэстрэстаўрацыяпраект. Гэта першая рэстаўрацыйна-праектная арганізацыя, якая падключыла да сваёй працы археолагаў. Такія працы вядуцца толькі ў Мінску і ў Берасцейшчыне.

**- А ці хутка беларуская археалогія можа выйсці на еўрапейскі ўзровень?**

Уся праблема ў нас у падрыхтоўцы кадраў, якіх катастрафічна не хапае. У Беларусі Акадэмія навук кожны год выдзяляе толькі адно ці там пару месцаў на навучанне археолагаў. Другая праблема – гэта фінансаванне. Неабходна больш грунтоўнае, праграмнае фінансаванне беларускай археалогіі.

**- Якія асацыяцыі ў Вас узнікаюць з самым маленькім горадам у Беларуі Косава?**

Калі я сваім калегам з Украіны і Расіі пісаў, што еду ў Косава, мне адразу званілі і гаварылі: "Вы што, там жа страляюць!". А я ім кажу, спакойна, у нас Косава нармальнае ціхае мястэчка...

**- Скажыце, падчас археалагічнай практыкі ці змяняецца ў студэнтаў погляд на нашую гісторыю, культуру, спадчыну нашых продкаў?**

Калі людзі практычна адчуваюць, што самі спрычыняюцца да ўзнаўлення гісторыі, то гэта ўжо пэўны адбітак накладае. Праз 10-20 год, калі гэты палац будзе функцыянаваць, кожны з гэтых студэнтаў, якія тут працуюць, прывядзе сваіх дзяцей і пакажа што ён гэты палац рэальна ўзнаўляў. А гэта ўжо немалаважна для завяявання аўтарытэта перад сваімі дзецьмі.

**- Вы пражываеце тут у палатках. Ці лёгка перажываюць гэта студэнты з гораду?**

На дзяўчат ускладзена самае важнае ў экспедыцыі – энергетычная падтрымка функцыянавання арганізмаў нашых хлопцаў.

**- Як вы ладзіце свой вольны час?**

Слухаем гукі прыроды, цішыню.Спартыўныя гульні – футбол, валейбол і інш. Акрамя таго ў нас вельмі добрая вясёлая кампанія. Ну канешне песні, бо нішто так не яднае, як добрая песня.

**- Як уратаваліся ад дажджоў, што былі днямі?**

Крыху падмачыла, але ў нас вельмі добрае абсталяванне, то мы пакуль не наракаем. А галоўны сродак ад мерзлаты – гэта археалагічная гарбата. Рэцэпт дам ў наступным нумары...

**Дзякуй, заінтрыгавалі...**

***Гутарыў Павел ДАЙЛІД***



# АКІНЧЫЦЫ:
## ІМКНЕННЕ ДА СВАБОДЫ

*У паўстанні 1863 года прымалі ўдзел самыя розныя слаі насельніцтва – шляхта, духавенства, мяшчане, сяляне, аднадворцы. Вельмі часта ў паўстанцкія атрады сыходзілі цэлыя сем'і, прадстаўнікі некалькіх галін аднаго рода. Напрыклад, беларускі шляхецкі род Акінчыцаў вядомы сваім удзелам яшчэ ў паўстанні 1830-1831 гг. У дадзеным артыкуле, складзеным на падставе архіўных крыніц, распавядаецца пра некалькіх прадстаўнікоў гэтага роду, пражываўшых на тэрыторыі Гродзенскай губерні і прымаўшых самы непасрэдны ўдзел у паўстанні 1863-1864гг.*



**Station:** 

**Станіслаў.** Пасля аднаго з баёў паўстанцкага атрада Густава Стравінскага з урадавымі войскамі ў пачатку восені 1863г. у Ваўкавыскім павеце ў забітага паўстанца, памешчыка гатага ж павета Леона Булгарына – у кішэні ўладамі быў знойдзены спіс членаў некаторых з паўстанскіх атрадаў, што дзейнічалі на тэрыторыі Гродзенскай губерні. У гэтым спісе, у ліку іншых 19 імёнаў, пад чацвёртым нумарам значылася: "Окинчиц – два брата, один арт. отс. офицер, другой студент (вероятно)". У ходзе праведзенага следства ўладам удалося ўстанавіць асобу першага. Ім быў дзейсны прапаршчык 3-яй палявой артылерыйскай брыгады Станіслаў Фадзеевіч Акінчыц, які скончыў Беластоцкую гімназію і Канстанцінаўскую ваенную вучэльню. У красавіку 1863г. ён перайшоў на бок паўстанцаў і, напэўна, знаходзіўся ў складзе атрада Фелікса Улодэка, буйнага памешчыка Берасцейскага і Пружанскага паветаў.

**Фелікс.** Праз тры гады пасля паўстання, летам 1866г. пры рабоце ў маёнтку памешчыка Слонімскага павета Фадзея Акінчыца мясцовы селянін знайшоў іржавы зламаны пісталет і аддаў яго эканому гэтага маёнтка. Той паведаміў павятоваму прыставу, і да гаспадара маёнтка прыехала паліцыя. На гарышчы паліцыянты знайшлі 11 фотаздымкаў «разных лиц и в разных костюмах со следующей надписью: «в память дружбы Феликсу Окинчицу». Сам Фелікс выяўлены быў на фотаздымку ў польскім нацыянальным касцюме з канфедэраткай на галаве, што ў той час лічылася сур'ёзным злачынствам і бунтам. На наступных допытах стала вядома, што Фелікс Акінчыц, выява якога была на фотаздымку, з'яўляўся сынам памешчыка. Нарадзіўся Фелікс у 1841г., а ў 1862г. ён з'ехаў з дому з мэтай паступаць у Пецярбург у Імператарскае вучылішча правазнаўства. Аднак, ужо летам 1863г., паводле звестак мясцовых сялян і самога бацькі, Фелікс "блукаў па навакольным вёскам у польскім адзенні". Пры гэтым ён змог упэўніць бацьку, што прыехаў з Пецярбурга на вакацыі як студэнт вышэй названай навучальнай установы. Пасля Фелікс нечакана знік і больш не з'яўляўся дома. Стары памешчык прыйшоў да высновы, што "сын з'ехаў назад у Пецярбург па неадкладных справах". У выніку зробленага ў Пецярбург запыту на «предмет нахождения в столице студента Окинчица Феликса, Фаддея сына» і атрыманага адказу стала зразумела, што Фелікс не паступаў у вучылішча правазнаўства і ніколі не жыў у сталіцы. Уладам так і не ўдалося ўстанавіць месцазнаходжанне Фелікса, як і высветліць, чым ён займаўся ў перыяд 1863-1864гг. Аднак «на всякий случай», на памешчыка Фадзея Акінчыца быў накладзены штраф памерам 300 рублёў "за хранение огнестрельного оружия" і ўсталяваны паліцэйскі нагляд па асабістаму распараджэнню Віленскага генерал-губернатара.

**Уладзіслаў.** Многія ўдзельнікі паўстанцкага руху, асабліва на тэрыторыях Пружанскага, Кобрынскага і Ваўкавыскага паветаў у выніку ўзгадвалі, што сярод іншых, у атрадах знаходзіліся некалькі Акінчыцаў, два з якіх – урачы. Цалкам верагодна, што трэцім мог быць той няўлоўны Фелікс. Але пра першых двух дакладна вядома, што аднаго звалі Уладзіслаў, другога – Аляксандр. Звестак пра Уладзіслава таксама пакуль няшмат, але вядома, што ён жыў у Пружанскім павеце і "был в Волковысской шайке мятежников". Улады так і не змаглі знайсці доказы прыналежнасці Уладзіслава да паўстанцкага руху, таму ніякіх сур'ёзных мер супраць яго не прымалася. Справа была абмежаваная тым, што ён быў прызнаны «неблагонадёжным» і трапіў пад нагляд паліцыі.

**Людвіг.** У Гарадзенскім гістарычным архіве маюцца таксама звесткі пра знаходжанне пад арыштам у старым замку з 25 чэрвеня 1863г. урача Людвіга Акінчыца, таксама прымаўшага ўдзел у паўстанні. Ёсць меркаванне, што Людвіг з'яўляўся родным братам Станіслава і Фелікса, але, нажаль, больш аб ім звестак няма.

**Аляксандр.** Правяраючы спіс забітага Леона Булгарына ўлады паступова выйшлі і на акруговага ўрача Ружанскага павета Аляксандра Акінчыца, напэўна, найбольш гераічнага прадстаўніка гэтага шляхецкага роду.

Аляксандр Акінчыц быў арыштаваны 14 лістапада 1863г. "за бытность в мятежной шайке и не явку к властям по возвращении из оной" і дастаўлены ў Пружанскую турму. Вось, што ён распавёў пра сябе на допытах. Аляксандр Восіпавіч Акінчыц, шляхціч Пружанскага павета, 25 год, рымска-каталіцкага веравызнання, скончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта 10 чэрвеня 1861 года. 3 верасня 1862 года загадам міністра дзяржаўных маёмасцяў быў прызначаны звышштатным акруговым урачом Слонімскага павета, затым пераведзены на пасаду акруговага урача Ружанскага і Слонімскага паветаў. Пастаянна пражываў у мястэчку Шарашова Пружанскага павета. У красавіку 1863г., атрымаўшы прадпісанне ад Варшаўскага рэвалюцыйнага камітэта, пайшоў у паўстанцкі атрад Густава Стравінскага ў Ваўкавыскім павеце "разам з двума стрыечнымі братамі". З паказанняў сведкаў, Аляксандр знаходзіўся ў атрадах "як урач – лячыў, а не змагаўся". У паўстанцкі рух пайшоў добраахвотна: "была ідэя вельмі распаўсюджаная і даўняя – вызваленне сваёй Айчыны". Па вяртанні з паўстанцкіх атрадаў Аляксандр Акінчыц жыў у маёнтку сваёй маці ў вёсцы Немкавічы Пружанскага павета.

Ваенны суд, які адбыўся ў Гародні 13 красавіка 1864г. абышоўся з урачом вельмі жорстка, прысудзіўшы "бывшего окружного врача дворянина Александра Окинчица, 25 лет, за бытность в шайке мятежников добровольно ... лишив всех прав состояния по 3-й степени, сослать в каторжную работу в рудники на 15 лет".

А. Акінчыц не зламаўся на катарзе. У 1865г. ён змог збегчы з Томска ў Францыю. Тут у 1867г. пацвердзіў свой дыплом урача і назаўсёды застаўся на сваёй другой радзіме. Браў Аляксандр Акінчыц актыўны ўдзел у дзейнасці эміграцкіх арганізацый уцекачоў з тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Выступаў з публікацыямі ў прэсе. Напісаў мемуары «Успаміны з побыту ў Расіі ў 1863 г.», якія не былі апублікаваны. Памёр паўстанцкі лекар з Пружаншчыны ў Францыі ў 1886г.

***Алег КАРПОВІЧ,***
***Гродна, ГрДУ імя Я. Купалы, аспірант***

*(перакл. з рус. мовы П. Дайлід паводле зборніка артыкулаў з навуковай канферэнцыі "Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае", Брэст, 2008)*

# ЗА ЗЯМЛЮ, ЗА ВОЛЮ

## ПОСТАЦІ ПАЎСТАННЯ 1863—1864 гг. У НАШЫМ КРАІ

Будучы яркім публіцыстам, К. Каліноўскі праз “Мужыцкую праўду” здолеў абудзіць у розных слаях грамадства прагу да свабоды і волі.

Патрабуючы знішчэння царскага самаўладдзя, ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, ён марыў аб надзяленні сялян зямлёй, стварэнні народна-дэмакратычнай рэспублікі. Марыў і змагаўся за гэта.

На барацьбу з паўстанцамі царызм кінуў значныя сілы (па падліках – амаль 145 тысяч салдат, 146 гармат і 60 казацкіх соцень). Паўстанне было задушана, К. Каліноўскі арыштаваны і 22 сакавіка 1864 года павешаны ў Вільні. Тысячы паўстанцаў прыняла на вечны спачын беларуская зямля. Тых, каго не ўдалося паланіць, вешалі, асуджалі на катаргу ў Сібір, высылялі на жыхарства ў цэнтральныя губерні Расіі. Нават тых, хто спачуваў паўстанню.

Па загаду Мураўёва-вешальніка забаранялася выказваць усялякую праяву жалобы па забітых і павешаных. Ды людзі ўпотай ушаноўвалі і паміналі загінуўшых. Сотні абразоў было прымацавана да соснаў, на якіх вешалі паўстанцаў і на ўзгорку, што каля Івацэвіч. І да гэтага часу завуць месца Шыбельнай гарой. На жаль, шмат магіл так і засталіся безыменнымі, многія імёны ўдзельнікаў паўстання адышлі ў нябыт.

У свой час, працуючы ў Гродзенскім дзяржаўным архіве, мне пашчасціла натрапіць на так званы “Імянны спіс мяшчан, якія адлучыліся з месц свайго жыхарства ў І стане Слонімскага павета” (фонд 1624, вопіс 2, справа 20. Пачата 9 верасня 1863 г.).

Становы прыстаў І стана (подпіс неразборлівы) склаў спіс тых людзей, якія пакінулі месца жыхарства (пасля некаторыя з іх вярнуліся да сваіх хат).

Няцяжка здагадацца, што гэта былі грамадзяне, якія прынялі ўдзел у паўстанні. Тых, хто вярнуўся ў родныя мясціны, арыштоўвалі і адпраўлялі ў слонімскую турму. Вось гэты спіс. Можа хто з жыхароў раёна даведаецца і пазнае ў іх сваіх продкаў.

1.**Ігнат Лукоўскі**, часоваабавязаны селянін Косаўскай воласці. 22 красавіка 1863 г. пакінуў Гуту (там знаходзіліся шклозавод і смалакурня памешчыка Пуслоўскага. Цяпер гэта месца ў Гута-Міхалінскай пушчы – **А. З.**). Вярнуўся 6 верасня 1863 года і адпраўлены ў Слонім.

2.**Андрэй Рудзьман**, адстаўны салдат. 19 лютага 1863 г. пакінуў маёнтак Пескі. Затрыманы і адпраўлены ў Кобрын.

3.**Мікалай Рудзьман**, часоваабавязаны селянін з Песак. Адлучыўся 19 лютага 1863 г. з м. Пескі. Затрыманы і адпраўлены ў Кобрын.

4.**Міхаіл Паўшко**, часоваабавязаны селянін Косаўскай воласці. Пакінуў Гуту 22 красавіка 1863 г.

5.**Адам Кавалеўскі**, жыхар Царства Польскага. Пакінуў Гуту 22 красавіка. Вярнуўся 6 верасня 1863 г. і адпраўлены ў Слонім.

6.**Іван Мураўскі**, жыхар Царства Польскага. Пакінуў Гуту 22 красавіка. Вярнуўся 6 верасня 1863 г. і адпраўлены ў Слонім.

7.**Восіп Сяргейчык**, селянін Косаўскай воласці. 22 красавіка пакінуў Гуту. Вярнуўся 10 верасня 1863 г., адпраўлены ў Слонім.

8.**Міхал Барцінскі**, жыхар Царства Поль-скага. 22 красавіка пакінуў Гуту. Вярнуўся 6 верасня 1863 г. і адпраўлены ў Слонім.

9.**Ксаверы Карпінскі**, вольны чалавек. 10 мая пакінуў Аўсто. Вярнуўся 6 верасня 1863 г., адпраўлены ў Слонім.

10.**Казімір Ярошчык**, селянін Косаўскай воласці. Пакінуў Косава 22 красавіка 1863 г.

11.**Уладзіслаў Главацкі**, шляхціц Пакінуў Косава 10 мая 1863 г.

12.**Аляксандр Гжацкі**, селянін Кастровіцкай воласці. 16 мая пакінуў паштовую станцыю Заполле (цяпер Няхачава – **А. З.**). Вярнуўся 6 верасня 1863 г., адпраўлены ў Слонім.

13.**Сцяпан Хоміч**, селянін Дабромысленскай воласці. 16 мая пакінуў паштовую станцыю Заполле. Вярнуўся 4 верасня 1863 г., адпраўлены ў Слонім.

14.**Аляксандр Еранчыкаў**, вольны чалавек. 16 мая пакінуў паштовую станцыю Заполле. Вярнуўся 4 жніўня 1863 г.

15.**Валерый Захаржэўскі**, вольны чалавек. Пакінуў маёнтак Марачоўшчына 19 мая 1863 г.

16.**Адам Герман**, казённы селянін Жыровіцкай воласці. Пакінуў Гошчава 19 мая 1863 г.

17.**Адольф Вольскі**, шляхціц. 29 мая 1863 г. пакінуў ферму Булу.



18.**Антон Глушэня**, селянін Івацэвіцкай воласці. Пакінуў в. Руду 7 чэрвеня 1863 г.

19.**Адольф Малахоўскі**, вольны чалавек. 29 мая 1863 г. пакінуў маёнтак Харошчу.

20.**Андрэй Бялевіч**, казённы селянін з Пружанскага павета. 29 чэрвеня 1863 года пакінуў вёску Совін.

21.**Сігізмунд Мушынскі**, вучань Пінскай гімназіі. 8 жніўня 1863 г. пакінуў маёнтак Некрасаўшчыну.

22.**Павел Хоміч**, селянін Дабромысленскай воласці. Пакінуў в. Дабромысль 25 красавіка 1863 г.

Далейшы лес гэтых людзей нам невядомы. Застаецца адно: ушанаваць іх хвілінай маўчання і сказаць: “Вечная Вам памяць...”

***Алесь ЗАЙКА, краязнаўца,***
***в. Заполле Івацэвіцкага раёна***



# ФРАНЦІШАК ЮНДЗІЛ

## НЕСКАРОНЫ ПАЎСТАНЕЦ



Яго імя рэдка згадваюць гісторыкі, асвят-ляючы паўстанне 1863-1864гг. Адзначаюць толькі ўдалыя дзеянні атрада пад кіраўніцтвам **Францішка Юндзіла** ў вядомай бітве пад Мілавідамі 3 чэрвеня 1863г. (усе даты даюцца па новаму стылю). А між тым, гэты чалавек прысвяціў усё сваё жыццё змаганню за вольнасць і незалежнасць Беларусі.

Нарадзіўся Францішак у сям'і небагатага шляхціца Уладзіслава Юндзіла і Багумілы Сухадольскай у 1825г. ў фальварку Югалін былога Слонімскага павета. На жаль, даты нараджэння выявіць нідзе не ўдалося. Бацькі выбралі яму кар'еру ваеннага і ён служыць у царскай арміі, якую пакідае ў 1858г. ў чыне ротмістра.

У гэты час назіраецца абуджэнне нацыя-нальных рухаў у Польшчы, Беларусі і Літве. На Беларусі рух гэты узначаліў К. Каліноўскі.

Вясною 1861г. Каліноўскі прыступіў да стварэння Гродзенскай рэвалюцыйнай аргані-зацыі. Вядома, што Францішак Юндзіл пасля адстаўкі месцам свайго жыхарства выбраў Гродна. Дом яго ў Гродне стаў прытулкам для маладых рэвалюцыянераў, дзе яны абмяр-коўвалі план паўстання, пэўным каардына-цыйным цэнтрам па аб'яднанню усіх патрыятычных сіл Айчыны.

22 студзеня 1863г. у Варшаве быў выпушчаны маніфест аб пачатку паўстання і дэкрэты па аграрнаму пытанню.

У ноч на 23 студзеня адбыліся першыя сутычкі польскіх паўстанцаў з царскімі войскамі.

Літоўскі паўстанцкі камітэт падтрымаў паў-станне, выпусціўшы друкаваную аб'яву: "Браты! Каралеўства паўстала!.. Кроў, што льецца за Нёманам, кліча нас да зброі!"

З'явіліся першыя паўстанцкія атрады. Ф. Юндзіла прызначаюць на пост ваеннага начальніка Слонімскага павета і камандзірам атрада, які фарміраваўся ў лагеры паблізу Югаліна ва ўрочышчы "Старынка".

У хуткім часе да атрада Ф. Юндзіла, які налічваў ужо каля 300 касінераў, далучыўся атрад Ісідора Лукашэвіча, які быў сфарміраваны ў Мілавідах.

28 мая 1863 г. адбылася першая сутычка пад Літвінавым. Будучы ў цяжкім становішчы, Ф. Юндзіл выклікаў на дапамогу найбліжэйшы паўстанцкі атрад Аляксандра Лянкевіча, з якім злучыўся 1 чэрвеня. Гэтым жа днём прыбыў навагрудскі атрад В. Міладоўскага ў колькасці 136 чалавек.

Камандаванне аб'яднанымі сі-ламі (колькасць паўстанцаў склала 700-750 чалавек) узяў на сябе А. Лянкевіч. Свой лагер яны разбілі паблізу в. Мілавіды (сёння Баранавіцкі раён).

2 чэрвеня 1863 г. Кастусь Каліноўскі робіць агляд паўстанцаў, а ўжо 3 чэрвеня адбыўся вялікі бой з рэгулярным царскім вой-скам. Пасля перамогі ў гэтым баі пад Мілавідамі, аслабленыя атрады паў-станцаў адышлі і падзя-ліліся. Ф. Юндзіл са сваім атрадам пасля сутычкі з непрыяцелем пад Сяльцом падаўся праз балоты ў кірунку Целяхан. Па яго следу гналіся ворагі.

У раёне Агінскага канала Юндзіл перадаў навагрудскі атрад касінераў тутэйшаму ваеннаму кіраўніку, а сам павярнуў у кірунку Слоніма. Сведка гэтых падзей успамінаў пасля: "Пачалася для слонімскага атрада пара перахо даў самот-ных, туляння па лясах і балотах сярод неспа-койных вёсак".

Усё цяжэй і цяжэй было пазбягаць сутычак з ворагам аслабленным паўстанцам.

Каб быць менш прыкметным, атрад зноў падзяліўся. Адна яго частка на чале з Ісідорам Лукашэвічам узяла кірунак на Быцень, маючы на мэце зноў злучыцца ў Тартацкіх лясах. На жаль, толькі невялікая колькасць атрада даб-ралася да мэты. Пад Міронімам атрад Лука-шэвіча быў разбіты. Відаць, тады і загінуў вер-ны сябар і паплечнік Францішка Юндзіла – Ісі-дор Лукашэвіч. Пахаваны ж Лукашэвіч у брац-кай магіле разам з Красінскім і невядомым паўстанцам у м. Косава на каталіцкіх могілках. У 1928 г. ўдзячныя нашчадкі паставілі на іх ма-гіле помнік...

... 13 чэрвеня Юндзіл атрымаў загад перайсці ў палескія балоты і далучыць свой атрад да атрада, якім камандаваў Калупайла. 30 жніўня 1863 г. Францішак Юндзіл прымае ўдзел у баі пад Глыбокім Кутам.

З выпадку заняпаду паўстання на Беларусі Юндзіл перапраўіўся праз Буг і ўжо 29 каст-рычніка быў у Кракаве, дзе прызначаецца ка-мендантам гэтага горада. 20 студзеня 1864 г. прызначаны арганізатарам Кракаўскай вайсковай акругі.

12 лютага 1864 г. яму было нададзена званне падпалкоўніка. У пачатку сакавіка з выпадку дрэннага здароўя выехаў у Францыю, дзе лечыцца ў парыжскім шпіталі. Але адолець хваробу не змог. Памёр Францішак Юндзіл, мужны кіраўнік паўстанцаў, 13 ці 14 лютага 1865 года.

***Алесь ЗАЙКА, краязнаўца,***
***в. Заполле Івацэвіцкага раёна***






# КЛЯШТАР КАРТУЗАЎ У БЯРОЗЕ:
## СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ (1648-2008 гг.)


Малюнак Напалеона Орды

**Ордэн (закон) картузаў заснаваны ў 1084г. святым Бруна (прафесарам тэалогіі) у пус-тэльні Шартроз (лац. Cartusia), размешчанай у гарыстай мясцовасці каля Грэнобля (Фран-цыя). Прафесар адрокся ад свету і з двума аднадумцамі пайшоў у манахі. Статут ордэна, прыняты ў 1134г. і зацверджаны ў 1170г., стаў самім строгім з усіх ордэнскіх статутаў – у кар-тузаў не было агульных памяшканняў для сумеснага прыёму ежы: манах атрымоўваў прадукты праз асобную адтуліну з двума паваротамі, каб не бачыць рук чалавека, які падаваў іх, а затым гатаваў сабе ежу сам.**

Манахі не мелі ніякіх кантактаў з наваколь-ным светам і фактычна стварылі "дзяржаву ў дзяржаве". Папярэднікі картузаў – бенедык-тынцы – па меры накаплення багацця, пераў-тварэння іх у буйных землеўласнікаў, і звя-занага з гэтым псаваннем нораву манахаў страцілі аскетычнасць і суровую строгасць статуту. Картузы максімальна строга рэгла-ментавалі сваё жыццё і рымскі папа прыхільна ставіўся да іх, таму ордэн хутка пашыраў сваю дзейнасць у еўрапейскіх краінах. Строгасць правіл закону картузаў зрабіла ордэн адносна нешматлікім і нават элітарным, але з канца XVII стагоддзя пачынаецца яго заняпад.

У 1646г. картузы з Картузаў (каля Гданьска) адправілі магнату Казіміру Льву Сапезе ліст, дзе азнаёмілі яго з гісторыяй ордэна картузаў і далі некаторыя звесткі пра свае найбольш вядомыя кляш-тары, і ўжо праз два гады папскі нунцый Джаван-ні дэ Торэсам заклаў першы камень новага кляштара ў Бя-розе.

Даследчыкі лі-чаць, што архі-тэктарам кляш-тара стаў італь-янскі майстар Жан Батыста Гіслені. Казімір Сапега ахвяра-ваў на будаў-ніцтва дзесяць тысяч залатых чырвонцаў, яго таксама падтрымала мясцовая шляхта і ўнесла вялікія ахвяраванні.

Даследчыкі параў-ноўваюць кляштар з манастыром Святога Бернара ў Альпах, манахі якога вывелі спе-цыяльную пароду сабак дзеля адшуквання заблукаўшых у гарах падарожнікаў. Мэтаю ж бярозаўскіх манахаў было "адшукванне душ і перавод іх да каталіцызму".

Перыяд 1648-1651гг. азначаны вялікаю вайною Рэчы Паспалітай з казакамі, а таксама з Маскоўскім княствам, з 1655г. у гэтую вайну ўцягнуліся шведы. Сапега прымаў удзел у вайсковай кампаніі і не мог адпаведна клапаціцца аб сваім кляштары. Магнат памёр 19 студзеня 1656г. перад асвячэннем кляш-тарнага касцёла, але завяшчаў картузам вя-лікую суму грошай, вялікі зямельны надзел і



васемсот сялянскіх двароў. Усяго на кляштар пайшло каля трохсот тысяч залатых чыр-вонцаў, што адпавядае тоне золата. Нарэшце, 6 чэрвеня 1666г. біскуп Самагіціі Аляксандр Сапега (сваяк заснавальніка) асвяціў касцёл, падчас гэтай падзеі адбылося перазахаванне К. Л. Сапегі ў манастырскім склепе.

Нямецкія візітатары (рэвізоры) у 1655г. пісалі: "Некалькі разоў ён (кляштар) быў абра-баваны маскавітамі, татарамі ды і падобнымі варварамі, пакінуты сваімі насельнікамі, якія збягалі ў іншыя вобласці, што належалі ордэну…". Таму будаўніцтва кляштара скон-чана толькі ў 1689г., але пабудаваны быў сапраўдны комплекс. Напрыканцы будаўніцтва кляштара, наведвальнікі склалі справаздачу, у якой адзначалі, што касцёл "ob sui magnificen-tiam simile non habemus in nostra Provincia Rheni" ("з прычыны свайго хараства не мае падобных у нашай правінцыі Рэйн").

Стварыўшы своеасаблівую ферму, картузы здолелі акліматызаваць на нашай зямлі чарапах – кавалак панцыра гэтай жывёлы (прычым не мясцовай жоўлы) знойдзены ў пластах XVIII стагоддзя падчас археалагічных раскопак. Нешта экзатычнае чуваць і ў прадпісаннях для правінўшыхся манахаў: апрацоўка вінаградніка, праца ў разарыуме… Непадалёку ад касцёла стаяў палац для пілігрымаў, што ішлі да картузаў з усяго свету. У канцы XVIII стагоддзя пры манастыры працавала прыхадская школа, дзе навучаліся дзеці навакольнай шляхты. Парадак у картузаў быў настолькі жорсткі, што некаторыя манахі ў XVIII стагоддзі пераходзілі ў крыху вальнейшы закон францішканцаў.

У 1866 г. па распараджэнню ўлад кляштар часткова разабралі, а ў казармах, пабудава-ных з яго цэглы, размясцілі 151-ы Пяцігорскі полк. У 1915 г. кляштар згарэў, а касцёл быў разбураны: засталіся толькі руіны касцёльнай вежы, вонкавая брама і фасадная частка кляштара.

На мармуровай дошцы ля ўваходу ў касцёл манахі некалі загадалі выгравіраваць надпіс на латыні з страшэнным праклёнам таму, хто асмеліцца парушыць гэты храм Боскі і з`яднаны з ім кляштар. Расійскі імператар Мікалай І не паслухаў яго і праклён збыўся, але своеасаблівым чынам: у 1934-1939 гг. улады Другой Рэчы Паспалітай размясцілі ў казармах, якія атрымалі назву "Чырвоныя", канцлагер.

Да нядаўняга часу лёс манастыра, дакладней таго, што ад яго засталося, зда-ваўся вельмі незайздросным. На тэрыторыі, дзе калісьці размяшчаўся найпрыгажэйшы кляштар ордэна картузаў, унесены ў Фран-цузскую энцыклапедыю мастацтваў, не так даўно знаходзілася вайсковая частка, якая … разводзіла тут свіней.

Здавалася, што надзеі вярнуць Бярозе яе гістарычны твар няма, але яна з`явілася пасля таго, як кляштар уключылі ў абласную праграму першачарговых аб`ектаў рэстаўрацыі і будаўніцтва манументальных помнікаў на 2004-2010 гг. У канцы 2005 года на пасяджэнні каардынацыйнага савету па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны пад кіраўніцтвам старшыні Бярозаўскага райвыканкама Ю.І. Наркевіча прынята пастанова аб рэстаўрацыі кляштара ў два этапы, на гэтую справу ў 2006 г. выдзелена дваццаць пяць мільёнаў, ідзе збор сродкаў сярод мясцовага насельніцтва. Падводзячы вынікі, можна сказаць, што ў апошні час ажыла надзея на тое, што Бяроза верне свой гістарычны твар, а праклён Сапегаў назаўсёды застанецца ў мінулым.

*Віталь ГАРМАТНЫ,*
*Баранавічы, выкладчык БарДУ,*
*гісторык*





Фотаздымкі з сайта radzima.org

# СТАНІСЛАЎ ЯГАДЫНСКІ

## НАШ ЗАБЫТЫ ЗЯМЛЯК

**Сярод забытых імёнаў Бацькаўшчыны асобна трэба выдзеліць імя Станіслава Серафіна Ягадынскага (Ягадзінскага). Рэдка ў якой энцыклапедыі, нават найнавейшай, можна знайсці звесткі пра гэтага чалавека. Але ж асоба гэта была неардынарная, таленавітая і цікавая. Тым больш, што жыццё і дзейнасць Ягадынскага звязана з нашай малой радзімай – Пружаншчынай.**

Станіслаў Серафін Ягадынскі (1590 ці 1594 – каля 1644г.г.) – гэта выдатны паэт, перакладчык, педагог і знаўца геральдыкі – навуковай дысцыпліны, якая вывучае гербы. Гістарычныя крыніцы, як і факты самой біяграфіі гэтага чалавека, сведчаць, што паходзіў ён са збяднелай беларускай шляхты. Аднак, усё ж існуюць розныя меркаванні даследчыкаў аб месцы нараджэння Станіслава Серафіна – гэта Жамойція (сучасная Літва), Гарадзеншчына ці мястэчка Шарашова на Пружаншчыне.

З тых невялікіх звестак, што маюць сучасныя навукоўцы, вядома, што ў 1613 – 1618г.г. Станіслаў Серафін вучыўся ў выдатнейшай вышэйшай навучальнай установе Вялікага княства Літоўскага—Віленскай езуіцкай акадэміі. Менавіта ў гэты час ён стаў спрабаваць пісаць. Першымі яго творамі былі панегірыкі (усхваляльныя прамовы), прысвечаныя прадстаўнікам уплывовай беларускай знаці (напрыклад, Геранiму Валовічу – падканцлеру Вялікага княства Літоўскага і інш.), якія выдаваліся ў віленскай друкарні Яна Карцана. Вернасць панегірычнаму жанру Ягадынскі захаваў на ўсё жыццё. Засталіся некаторыя такія яго працы на польскай і лацінскай мове, праўда, у іх даволі часта сустракаліся беларускія словы і звароты, што дало падставу даследчыкам меркаваць аб яго беларускім паходжанні.

Аднак, у першую чаргу Станіслаў Серафін Ягадынскі вызначыўся ў польскай літаратуры XVII ст. як выдатны паэт-сатырык. У Кракаве выходзілі яго зборнікі сатырычных эпіграм, якія карысталіся вялікай папулярнасцю, аб чым сведчыць іх неаднаразовае паўторнае перавыданне: *"Гром"* (1618г.), *"Маскі масленічныя і паўсюдныя ..."* (1619г.), *"Грош пад заслонай і аздобай крылаў караля птушак арла князёў Радзівілаў ..."* (1620г.), *"Прыдворныя ("Дваранкі")* (1621г.), *"Каталіцкія песні"* (1638 г.) і іншыя.

Трэба адзначыць, што XVII ст. – гэта пачатак росквіту мецэнацтва ў Рэчы Паспалітай. Сярод ліцвінскіх і польскіх магнатаў у гэты час стала папулярным фундатарства – апякунства таленавітай, але беднай шляхецкай моладзі, а таксама навукоўцаў, літаратараў, музыкантаў і мастакоў. Заможныя асобы імкнуліся не толькі садзейнічаць такім людзям, але і самі набываць адукацыю, знаёміцца з дасягненнямі культуры і навукі. У буйных магнацкіх рэзідэнцыях менавіта ў гэты час з'явіліся першыя сапраўдныя бібліятэкі, архівы, партрэтныя галерэі, зборы розных калекцый і г.д.. У гэтае рэчышча трапіў і наш суайчыннік. Дзякуючы матэрыяльнай і маральнай падтрымцы шляхціцаў А. і К. Халецкіх, Ягадынскі ў 1619г. здолеў удасканаліць сваю адукацыю – паступіў на факультэт права ў Кракаўскі (Ягелонскі) універсітэт, які паспяхова закончыў ў 1620г., а пасля – у 1622г. працягнуў навучанне ў Падуанскім універсітэце (Італія), дзе вучыўся калісьці і усходнеславянскі першадрукар Францыск Скарына. Зразумела, што ўдзячнасць за падобную дапамогу магла быць таксама асаблівай – Станіслаў Серафін напісаў усхваляльныя творы ў гонар сваіх апекуноў-патронаў, і два вершаваныя ўступы да кнігі Мікалая Халецкага *"Алегорыя"*.

Адукаваны малады чалавек, завязаў у гэты час патрэбныя знаёмствы не толькі сярод багацейшай і асветнай шляхты, але нават пры каралеўскім двары Рэчы Паспалітай. На яго звярнуў увагу польскі кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III Ваза (1587 – 1632), які абраў Ягадынскага ў памочнікі свайму сыну Уладзіславу. У 1624 – 1625г.г. Станіслаў Серафін суправаджаў каралевіча ў яго падарожжы па Германіі, Бельгіі, Італіі (у тым ліку ў якасці перакладчыка). Пасля гэтых падзей ён ў 1625г. паступіў на службу да даверанай асобы манарха трокскага кашталяна і нясвіжскага ардыната Яна Ежы Радзівіла (аднаго з самых адукаваных людзей свайго часу – вучыўся ва універсітэтах Германіі і Італіі) і жыў пры яго шыкоўным, не горшым за каралеўскі, двары ў Нясвіжы. Напэўна, знаёмства гэтых людзей адбылося ці падчас замежнага ваяжу Уладзіслава, ці сумеснай вучобы ў Падуі. У гэты час Ягадынскі падарожнічаў са сваім новым апекуном па Беларусі – наведаў Кобрын, Жыровіцы, Гародню. Аднак, у 1625г. Ян Ежы памёр і Ягадынскаму прыйшлося шукаць новую службу. Некаторы час (1627 – 1629 г.г.) ён працаваў ў канцылярыі кракаўскага біскупа М. Шышкоўскага. У будучым вопыт падобнай працы яму вельмі спатрэбіўся.

Аднак сярод магнацтва Рэчы Паспалітай Ягадынскі быў вядомы ў першую як выдатны знаўца законаў геральдыкі. Многія польскія і ліцвінскія феадалы запрашалі яго для афармлення ўласных геральдычных знакаў – гербаў. У выніку скрупулёзнай шматгадовай працы ім быў складзены гербоўнік шляхецтва дзяржавы – *"Сумарыюш клейнотаў або гербаў дзяржавы і рыцарства Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага з розных аўтараў, а менавіта з Бельскага, з Папроцкага і запісаў С.С. Ягадынскага сабраны"* (1621 г.) – галоўная яго навуковая работа, што дайшла да нашых дзён.

Менавіта Ягадынскаму таксама прыпісваюць і аўтарства першага польскага падручніка па каліграфіі *"Каліграфія, або Канцылярыя"* (1640 і 1695г.).

С.С. Ягадынскі вызначаўся таксама як выдатны перакладчык. З італьянскай мовы на польскую ім былі перакладзены лібрэта опер *"Вызваленне Руджьера з вострава Альцыны"* Ф. Сарачынелі ў 1628г. і *"Трыумф кахання"* Франчэска Пятраркі (застаўся толькі ў рукапісе).

Многія гады жыцця гэтага чалавека не зафіксаваны а ні ў якіх крыніцах, у яго біяграфіі, як кажуць шмат *"белых плям"*. Аднак, вядома, што ў канцы жыцця Станіслаў Серафін Ягадынскі аказаўся ў Шарашове – служыў у *"каралеўскім маёнтку Шарашова"*. Напэўна, у якасці ўпраўляючага. Хутчэй за ўсё, там ён і закончыў сваё жыццё.

Хочацца, каб імя Ягадынскага зацікавіла не толькі землякоў, але і навукоўцаў. Тады, магчыма, праз некаторы час нам удасца даведацца аб ім значна больш.



**Шляхецкае адзенне XVI ст.**

***Наталля ПРАКАПОВІЧ,***
***г. Пружаны,***
***гісторык, краязнаўца***

# Урыўкі з гербоўніка



Герб "Пагоня"



Герб "Ліс"



Герб "Магіла"

Геральдыка (лац. heraldika – "вяшчальнік") ці герба-знаўства – сістэма ведаў пра гербы, правілы іх складання і выкарыстання; а таксама – гістарычная дысцыпліна, якая вывучае старажытныя і ўтварае новыя гербы. Правіламі геральдыкі ведалі спецыяльныя асобы – герольды, якія стваралі гербы для абазначэння сем'яў, асоб, карпарацый, гарадоў, правінцый, дзяржаў і фіксіравалі ў зводах-гербоўніках. Наогул, слова "герб" нямецкае і азначае – "спадчына". Размяшчалі такія знакі арознення на харугвах, шчытах, пячатках, зброі, хатнім начынні, творах мастацтва, будынках і інш.

У XIII – XIV стст. у Вялікім княстве Літоўскім з'явіліся першыя шляхецкія гербы, якія сведчылі аб пранікненні ўплыву крыжакоў-рыцараў з Лівоніі і Прусіі. Больш позняе з'яўленне такіх сімвалаў звязваюць з Польшчай. А менавіта з заключэннем вялікім князем Ягайлам Крэўскай уніі 1385г. з Каронай. Але афіцыйны пачатак геральдыкі ВКЛ вядзецца ад Гарадзельскай уніі 1413г. Акрамя іншых прывілеяў у граматах уніі 47 польскіх феадалаў надзялялі 47 феа-далаў-католікаў ВКЛ сваімі гербамі і прымалі іх у сваё брацтва, а тыя ў адказ бралі гербы польскіх шляхціцаў і абяцалі ім вечную дружбу і саюз. У пачатку XV ст. у Вялікім княстве з'явілася пасада герольда ("Lither-land").

Наяўнасць герба – сімвал гонару, старажытнасці роду, прыналежнасці да рыцарства. У сярэднявечны рэдка хто з феадалаў быў пісьменным - галоўным заняткам была вайна - таму герб з'яўляўся своеасаблівым малюнкам, які дазваляў "прачытаць" аб асобе ўладальніка і яго сям'і. Такі знак меў пэўныя асаб-лівасці. Ён складаўся са шчыта, кляйнода (фігуры над шчытом), кароны – шляхецкай, княжацкай, графскай, каралеўскай і інш., мог мець шчытатрымальнік, стужку з дэвізам і футра. Шчыты (тарчы, таркі) былі рознай формы і насілі назвы – варажскі, італьянскі, іспанскі, французскі, нямецкі.

Кожны знак і колер на гербе мелі свой сэнс. Французскі герольд XVII ст. П.Ансэльм сцвярджаў: "Золата абазначае хрысціянскія дабрадзецелі – веру, справядлівасць, міласэрнасць і змірэнне – і мірскія якасці – магутнасць, знакамітасць, вернасць, багацце. Срэбра азначае чысціню, надзею, праўдзівасць, нявіннасць, а з мірскіх – высакароднасць, чысціню. Чырвоны колер адпавядае любові, мужнасці, смеласці і дабрачыннасці; чорны – асцярожнасці, мудрасці, вернасці ў выпрабаваннях; сіні – нявіннасці, дзевы Марыі, вернасці, праўдзівасці; зялёны – надзеі, багаццю, свабодзе і радасці. Пурпур (фіялетавы) азначае гонар, умеранасць, шчодрасць і вышэйшае панаванне". Залаты (жоўты) і срэбраны (белы) колеры на гербах сведчылі аб высакароднасці, а палі азначалі наступнае: чырвонае – кроў, пралітая за царкву ці манарха, сіняе – неба, зялёнае – луг, чорнае – сум, цемра і інш.

У XV ст. ў Польшчы і ВКЛ з'явіўся першы ўласны гербоўнік, аўтарам якога лічаць гісторыка Яна Длугаша. Збор шляхецкіх сім-валаў Рэчы Паспалітай быў таксама складзены нашым земляком Станіславам Серафінам Ягадынскім у XVII ст. Гэтыя гербоўнікі адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх тым, што ў іх змяшчаліся не толькі самі гербы, але і скарочаная гісторыя рыцарскіх родаў дзяржавы.



Герб "Дарагаслаў"



Герб "Ястрабец"

Гербам "Пагоня" карысталіся князі Кобрынскія, што валодалі пружанскімі землямі ў XV – пачатку XVI ст.ст., і Чартарыйскія (панавалі некаторы час у Шарашове). Яны паходзілі з вяліка-княжацкага роду Гедымінавічаў і таму мелі права выкарыстоўваць дзяржаўны герб ў якасці дынастычнага. Словам "пагоня" ў ВКЛ называлі ўсеагульнае народнае апалчэнне, якое выстаўлялася падчас ваеннай небяспекі. Гэта павіннасць абавязвала кожнага здольнага насіць зброю мужчыну ўдзельнічаць у праследаванні ворага, таму выява вершніка на гербе – гэта быў сімвал абаронцы Айчыны, яе моцы і незалежнасці.

Самымі буйнымі ўладальнікамі маёмасці з XVI ст. да XIX ст. на нашай тэрыторыі былі Сапегі, якія адыгралі значную ролю ў гісторыі і культуры дзяржавы. Сярод іх асабліва трэба выдзеліць постаць вялікага канцлера Льва Сапегі (1557 – 1633), з імем якога звязваюць пачатак росквіту Ружанскага палаца, а таксама стварэнне першай у Еўропе канстытуцыі – трэцяга Статута ВКЛ 1588г. Родавым знакам Сапегаў, якія паходзілі з Полацкага княства, быў "Ліс" – вядомы з XIII ст. Гэты сімвал рыцарства мелі каля 200 сем'яў у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне.

Старажытныя Магілёўцы з XVI ст. належалі Быхаўцам, што вялі свой радавод са Смаленшчыны. Сям'я мела герб "Магіла". Набыццё ёю дадзенага сімвалу высакароднасці даследчыкі датуюць 1454г. Дзейнасць Быхаўцаў таксама адыграла важную ролю ў айчыннай гісторыі. Але назаўсёды іх імя будзе звязвацца з выдатным помнікам беларускага летапісання, так званай "Хронікай Быхаўца" XVI ст. Аўтарства твора спрэчнае, але ёсць меркаванне, што напісаны ён быў адным з прадстаўнікоў гэтага роду. У 1834 г. Аляксандр Быхавец перадаў "Хроніку" гісторыку Тэадору Нарбуту, аднак пасля смерці даследчыка ў 60-я г.г. XIX ст. арыгінал яе быў страчаны.

Крашэўскія з маёнткаў Доўгае і Куплін выкарыстоўвалі знак

# шляхты пружанскай



Герб "Даленга"



Герб "Кораб"

"Ястрабец", які з'явіўся на землях ВКЛ з XV ст і належаў каля 750 сем'ям. Крашэўскія паходзілі з Мазовіі (Польшча), і ў сярэдзіне XVIII ст. набылі ўласнасць на Пружаншчыне. Менавіта да гэтай сям'і належалі славутыя браты: гісторык, археолаг, пісьменнік, этнограф Юзаф Ігнацы Крашэўскі (1812 – 1887), Люцыян – удзельнік паўстання Кастуся Каліноўскага 1863 – 1864 г.г., фатограф, мастак і пісьменнік і Каятан – кампазітар, літаратар і астраном.

Маёнтак у Куплін у XVII – XVIII ст.ст. да Крашэўскіх трымалі багатыя і ўплывовыя шляхціцы Бухавецкія знаку "Дарагаслаў", а потым – Марачэўскія герба "Холева". Вядома, што Казімір Марачэўскі ў 1817 г. і 1825 г. выбіраўся пружанскім маршалкам – кіраўніком павятовага дваранства.

З канца XIX ст. Чахец і Магілёўцы належалі Дзяконскім, што карысталіся гербом "Кораб". Да гэтага шляхецкага роду належаў вядомы паэт першай паловы XX ст. Альбін Міхал Дзяконскі (1892 – 1939) – аўтар зборніку "Зялёныя Магілёўцы", які загінуў за сталінскімі кратамі. Гэты ж знак быў у славутага паэта і асветніка Францішака Карпінскага (1740 – 1825), які 29 год жыў на Пружаншчыне – арандаваў сядзібы ў Сухопалі і Красніку, жыў у Мураве. "Корабам" таксама валодаў пружанскі шляхціц Піліп Крыжаноўскі, які у 1805г. і 1807г. узначальваў павятовае дваранства. Наогул, гэты герб вызначаў прыналежнасць да вышэйшага саслоўя 180 родаў былой Рэчы Паспалітай.

"Даленгу", успрынятую вялікалітоўскімі шляхціцамі з Польшчы пасля Гарадзельскай уніі, меў адзін з пружанскіх маршалкаў Феліцыян Грабоўскі – ён займаў гэту пасаду ў 1798г. і 1800г.

Вялікія зямельныя ўладанні у канцы XVIII – пачатку XX ст.ст. (Лінова, Мікіцічы, Ліноўка, Ізабэлін і інш.) належалі заможнамай сям'і Трэмбіцкіх знаку "Слепаўрон" (вядомы з сярэдзіны XIV ст.), якія мелі дынастычныя сувязі з Радзівіламі і Ажэшкамі. Адзін з першых уладальнікаў Лінова Вінцэнт Трэмбіцкі заснаваў тут палац і вялікі парк з экзатычнымі дрэвамі, рэшткі якіх існуюць па сённяшні дзень. Прадстаўнікі роду займалася збіраннем твораў мастацтва, старажытных дакументаў, а ў сярэдзіне XIX ст. купілі значную частку бібліятэкі прафесара Віленскага універсітэта Міхаіла Баброўскага, які жыў у Шарашове. Зборы каштоўнасцей Трэмбіцкіх былі аднымі з самых выдатных у Заходняй Беларусі.

Шляхцічы Швыкоўскія, імя якіх звязана для нас з "палацыкам" і гісторыяй горада XIX ст., мелі сваім радавым гербом "Агеньчык".

"Два мячы" – шляхецкі сімвал Булгарынаў, што вядомы на Пружаншчыне ў якасці землеўласнікаў з XVII ст.. Асабліва цікавасць у гісторыі набыў Юзаф Булгарын, які быў пружанскім маршалкам у 1812г. Менавіта ў яго доме ў Пружанах сустракаліся і некалькі дзён гасцявалі рускія палкаводцы Баграціён і Тармасаў напярэдадні вайны з Напалеонам, каб скардынаваць свае дзеянні. Той жа Булгарын пасля акупацыі нашых зямель французамі стаў з імі актыўна супрацоўнічаць. Ён быў прызначаны падпрэфектам Пружанскага павета (кіраўнік мясцовай адміністрацыі на французскі манер) і адказваў за рэкруцкія наборы і рэквізіцыі на карысць варожай арміі. Цікава, што пасля вайны Юзаф не толькі апраўдаўся перад расійскімі ўладамі, але і атрымаў дзяржаўную ўзнагароду – ордэн Св. Уладзіміра 4 ступені.

Віслаухі з маёнтка Зянавіль (Ляжайка) валодалі гербам "Адынец". Цікава паходжанне назвы гэтага знака. "Адынцом" часта называлі чалавека, які жыў без сям'і ці быў адным дзіцем у бацькоў. А калі ўважліва чытаць класіка польскай літаратуры Генрыка Сенкевіча, можна не адзін раз сустрэць параўнанні жорсткага чалавека з дзікомадынцом, які вылучаўся падобнай якасцю. Крыніцы паведамляюць нам, што Віктар з Віслаухаў узначальваў шляхецтва Пружанскага павета ў 1807 г. З Віслаухамі звязана таксама цікавае рамантычна-трагічнае паданне. Пасля смерці аднага з гаспадароў маёнтка – Зянона, яго ўдава-прыгажуня пакахала суседа з Віднага. Невядома, што стала прычынай, але тайных палюбоўнікаў у адну з раніц знайшлі мёртвымі ў Зянавільскім парку.

Канечне, складана зараз падрабязна даведацца аб прадстаўніках шляхецтва, што калісьці жылі на нашых землях. Яшчэ цяжэй вызначыць іх гербавую прыналежнасць. Аднак справа гэта вельмі цікавая і дазваляе даведацца аб невядомых фактах мінуўшчыны Пружаншчыны.



Герб "Агеньчык"



Герб "Слепаўрон"



Герб "Адынец"

*Наталля ПРАКАПОВІЧ,*
*г. Пружаны,*
*гісторык, краязнаўца*

# АЙЦЕЦ БАЛЯСЛАЎ

## ЛЁС І СЛУЖЭННЕ СВЯТАРА Ў БАБРОВІЧАХ



*Калі я першы раз трапіў на грэка-каталіцкае набажэнства ў Берасці, святар запытаў мяне, адкуль я родам. Я адказаў: "З Івацэвічаў". Тады адгукнуўся адзін з парафіянаў, аматар гісторыі: "Дык там недалёка, у Бабровічах, перад вайною існавала ўніяцкая парафія!" Для мяне гэта было сапраўднае адкрыццё, бо я нарадзіўся менавіта ў гэтай вёсцы, адтуль паходзіць сям'я майго бацькі. Бог захацеў, каб праз захапленне беларускай гісторыяй я знайшоў тую Царкву, да якой яшчэ так нядаўна належалі мае продкі. Потым я пачуў імя душпастыра Бабровічаў, айца Баляслава Пачопкі, яго гісторыю, што для адных можа стацца прыгодніцкім раманам, а для другіх жыццярысам святога.*

Баляслаў Пачопка нарадзіўся 13 кастрычніка 1884 году ў вёсцы Уляны на Віленшчыне ў каталіцкай сялянскай сям'і Антонія Пачопкі. У 1899-1905 гадах ён навучаўся ў гімназіі ў Вільні, аднак пасля сканчэння шасці класаў перапыніў навучанне і ўвосень 1905 году паступіў у каталіцкую духоўную семінарыю ў Вільні. Праз два гады з-за слабага здароўя вымушаны быў пакінуць гэтую навучальную ўстанову. У 1908-1909 гадах Пачопка працаваў у Пецярбурзе, і там пазнаёміўся з асяроддзем беларускіх дзеячаў. Пасля вяртання са сталіцы працаваў прыватным настаўнікам і рыхтаваўся здаць экстэрнам экзамены на сярэднюю адукацыю. Здаў іх паспяхова ў 1911 годзе ў Шаўляі. Пакінуўшы віленскую семінарыю, Пачопка, здавалася б, развітаўся з думкаю пра святарства. Ён ажаніўся, нарадзіліся дзеці.

У 1913 годзе беларускія каталіцкія святары арганізоўваюць выданне ў Вільні газеты "Biełarus". Пачопка працуе спачатку кіраўніком рэлігійнага аддзелу, а ў лютым 1914 году становіцца галоўным рэдактарам. Адначасова ён апрацаваў і выдаў некалькі кніжак: "Malawyja listoczki" (1914), "Żyćcio papieża Piusa X" (1914), "Czaławiek na wyższynie swajej hodnaści" (1915), а таксама першы беларускі малітоўнік "Boh z nami".

Падчас Першай сусветнай вайны Пачопка працаваў у Камітэце дапамогі ахвярам вайны, спрычыніўся да стварэння першай беларускай настаўніцкай семінарыі ў Свіслачы, сам выкладаў там беларускую і лацінскую мовы. Падобна, у той час ён стварыў першую граматыку беларускай мовы, выдадзеную ў Вільні ў 1918 годзе. Праца гэтая была крытычна ўспрынятая іншымі беларускімі дзеячамі, але тым не менш, гэта быў першы падручнік беларускай мовы.

Бальшавіцкая ўлада, якая прыйшла на кароткі тэрмін у Заходнюю Беларусь, непрыхільна ставілася да беларускай дзейнасці будучага святара. Адчуваючы пагрозу арышту, Пачопка вымушаны быў хавацца на гарышчы сваёй хаты. Падчас гэтых "уцёкаў на пустыню" ён выразаў з дрэва ружанец з крыжом. На ім з аднаго боку выява Хрыста, а з другога – Маці Божай. Гэты ружанец па сённяшні дзень захоўваецца ў сям'і Пачопкаў як каштоўная рэліквія.

Лёс Пачопкі вырашыла спатканне з айцом Мікалаем Чарнэцкім, украінскім рэдэмптарыстам усходняга абраду, якога Слуга Божы Ян Павел ІІ беатыфікаваў у 2001 годзе. Пасля размовы з ім Баляслаў Пачопка звярнуўся да Апостальскай Сталіцы, каб атрымаць дазвол на пераход ва ўсходні абрад і прыняцце святарскіх свячэнняў. Такі дазвол ён атрымаў у 1921 годзе, а ў наступным пачаў завочнае навучанне ў грэка-каталіцкай семінарыі ў Львове. Адначасова, каб утрымаць сям'ю, якая складалася з жонкі і пяцёх дзяцей, Пачопка працаваў настаўнікам у Масюках Ваўкавыскага павету. Нарэшце 25 ліпеня 1926 году Баляслаў Пачопка, ва ўзросце 42 год, прыняў святарскія свячэнні ад мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага ў львоўскай катэдры св. Юра.

Адразу пасля свячэнняў Пачопка быў прызначаны парахам парафіі візантыйска-славянскага абраду ў Бабровічах, што ў Косаўскім павеце (сённяшні Івацэвіцкі раён). Парафія гэтая, створаная гадам раней, складалася з чатырох вёсак – Бабровічаў, Вяда, Тупічыцаў і Красніцы, якія знаходзіліся вакол Бабровіцкага (альбо Вядскага) возера. Падчас Першай сусветнай вайны жыхары Бабровічаў былі выселеныя "ў бежанцы", а калі вярнуліся, спрабавалі неяк наладзіць рэлігійнае жыццё. Нажаль, прысланы ў вёску праваслаўны святар ня меў належных для яго стану маральных якасцяў (быў п'яніцай), таму жыхары выгналі яго і звярнуліся вясной 1925 году ў дыяцэзіяльную курыю ў Пінску з просьбай прыслаць ім святара-ўніята.

Увосень у Бабровічы пазнаёміцца з сітуацыяй прыязджаў езуіт усходняга абраду з Альбярціна каля Слоніма айцец Васіль Буржуа. Ён адслужыў набажэнства і сказаў казанне. Людзі прасілі яго застацца назаўсёды, але ён мог толькі абяцаць падтрымаць у біскупа Пінскага іх просьбу даслаць сталага святара. Аднак за непоўны год існавання парафіі ўсходняга абраду ў Бабровічах святар тут змяняўся двойчы, пакуль у верасні 1926 году намінацыю не атрымаў а. Баляслаў Пачопка.

Асноўным абавязкам а. Баляслава ў Бабровічах было перадусім сумленнае і рэгулярнае служэнне нядзельных і святочных набажэнстваў і абвяшчэнне Слова Божага, нават калі яго казані слухала няшмат людзей. Важным заданнем было будаванне добрых адносінаў з парафіянамі і пазбяганне ўсяго таго, што магло б іх адвярнуць ад святара і Царквы. Вельмі далікатным было грашовае пытанне. Айцец Баляслаў не пытаў грошаў перад выкананнем святарскіх паслугаў, але спачатку выконваў сваё служэнне, а ўжо потым хто меў – складаў ахвяраванне, альбо абяцаў калі-небудзь дапамагчы працай, альбо проста паціху ўцякаў. Пахаванне і хрост "каштавалі" ў Бабровіцкай парафіі сімвалічную златоўку. За хрост абяцана таксама адпрацаваць параху, але часта гэтае абяцанне не выконвалася. "Даражэйшыя" былі шлюбы, яны "каштавалі" пяць злотых, але нават шлюбы Пачопка часамі даваў бясплатна. Па сённяшні дзень жыхары Бабровічаў узгадваюць, што да Пачопкі за святарскаю дапамогаю звярталіся таксама і жыхары навакольных праваслаўных парафіяў, якім цяжка было заплаціць кошты, усталяваныя сваім духавенствам.

Не азначае гэта аднак, што бабровіцкі парах меў дастаткова сродкаў на ўтрыманне сябе і сваёй сям'і – жонкі і сямі дзяцей, двое з якіх нарадзіліся ўжо ў Бабровічах. Наадварот, каб ўтрымаць сям'ю большасць часу святар быў вымушаны працаваць як звычайны селянін у полі альбо на сенажаці. Таксама а. Баляслаў Пачопка выконваў функцыі вікарыя ў рыма-каталіцкай парафіі ў Целяханах, што давала яму дадатковыя сродкі.

Душпастырскую працу Пачопка вёў па-беларуску, гэта значыць, што набажэнствы ён



# ПАЧОПКА:
## У МІЖВАЕННЫМ ДВАЦЦАЦІГОДДЗІ

служыў па царкоўна-славянску, а казанні гаварыў па-беларуску. Беларускай мовай карыстаўся святар на пачатку і ў навучанні рэлігіі ў дзьвюх школах, якія належалі да парафіі Бабровічы. Аднак дзяржаўныя ўлады забаранілі яму праз некаторы час выкарыстоўваць гэтую мову ў школе, і айцец Баляслаў вымушаны быў перайсці на польскую. Беларускай мовай карысталіся святар і яго жонка ў прыватных размовах з парафіянамі.

Дзьве вёскі, якія належалі да парафіі Бабровічы, знаходзіліся на іншым баку возера, і дабрацца туды без перашкодаў можна было толькі зімою, калі возера пакрывалася тоўстым лёдам. Там знаходзілася таксама пачатковая школа, праца ў якой лічылася ссылкай і настаўнікі змяняліся кожны год. Каб данесці Слова Божае да дзяцей з гэтых вёсак святар у любое надвор'е, не зважаючы на хвалі, веславаў на іншы бок возера.

Парафіяне вельмі любілі свайго святара. Нават сёння можна пачуць у Бабровічах, што такога бацюшкі не было і ніколі ня будзе. Аднак любоў не перашкаджала "удзячным парафіянам" пацягнуць красці ў пароха сена з сенажаці альбо снапы з поля, альбо нават мяса з кладоўкі.

Вялікім аўтарытэтам карысталася сярод парафіян жонка святара Марцыяна, званая згодна з праваслаўнаю традыцыяю "матушкай". Марцыяна Пачопка выконвала ў Бабровічах абавязкі павітухі, хаця ня мела скончанай медыцынскай адукацыі. Жонка святара сама нарадзіла сямёра дзяцей, і дапамагла нарадзіцца напэўна ўсім бабровіцкім дзецям. Таму яе кваліфікацыю вельмі высока ацэньваў целяханскі лекар Мароз. Пераязджаючы на іншае месца працы ён выпісаў Марцыяне Пачопка спецыяльнае пасведчанне, якое прызнавалі ягоныя наступцы. Пазней, калі а. Баляслаў захварэў на сэрца, Марцыяна выконвала цяжкія працы ў гаспадарцы.

Будынак бабровіцкай царквы, які быў перавезены пасля вяртання з "бежанцаў" з Вяда ў Бабровічы, быў вельмі стары і паступова прыходзіў у заняпад, так што ў 30-х гадах старэнькая цэркаўка пагражала разваліцца. Дзякуючы намаганням а. Баляслава ў 1932 годзе была збудаваная новая царква, значную частку грошаў на яе ахвяравала княгіня Магдалена Радзівіл. Іканастас для новай царквы зрабіў сам святар, які меў таксама разьбярскія здольнасці.

У чэрвені 1930 году парафію ў Бабровічах візітавалі біскуп Пінскі Зыгмунт Лазінскі і біскуп Мікалай Чарнэцкі, Апостальскі візітатар для каталікоў візантыйска-славянскага абраду на Палессі, Валыні і Падляшшы. У маі 1931 году парафію зноў візітаваў біскуп Чарнэцкі, а ў маі 1938 – біскуп Пінскі Казімір Букраба.

Падчас працы ў Бабровічах Баляслаў Пачопка працягваў супрацоўніцтва з беларускімі часопісамі, якія выходзілі ў Вільні, а таксама з іншымі перыядычнымі выданнямі, прысвечанымі справе Уніі. Ідэю уніі Пачопка прапагандаваў ва ўлётцы „Szto takoje Unia". Бабровіцкі душпастыр прымаў рэгулярна ўдзел у Пінскіх унійных канферэнцыях, двойчы выступаў на іх з дакладам.

Прыход савецкай улады ў верасні 1939 году цалкам змяніў лёс парафіі ў Бабровічах і яе душпастыра. Распачаўся паступовы пераслед: на плябаніі (дом святара) праводзілі вобшукі, шукаючы нейкую зброю, парафіяльную гаспадарку абцяжарвалі падаткамі, якія немагчыма было выплаціць. У выніку, святара некалькі разоў судзілі, што падарвала ягонае і без таго слабое здароўе. У лютым 1940 году невядомыя ўлезлі ў царкву і ўчынілі там пагром: скінулі з іканастасу іконы, паламалі падсвечнікі, нават пашкодзілі ахвярнік і даразахоўніцу. Новая ўлада, замест таго, каб шукаць вінаватых, абвінаваціла святара, што сам зрабіў гэта, каб падарваць аўтарытэт савецкай. Праз некалькі дзён у а. Баляслава скралі з гумна збожжа. Па свежым снезе хутка знайшлі злачынцаў, якія прызналіся таксама ў пагроме ў царкве, але сказалі, што зрабілі гэта не з уласнай ініцыятывы.

Усе вышэй узгаданыя падзеі прывялі да пагаршэння здароўя айца Баляслава, асабліва да абвастрэння хваробы сэрца. Вясною 1940 году ён некалькі тыдняў правёў у шпіталі ў Целяханах, пасля чаго адчуў сябе лепей. Увосень аднак хвароба зноў абвастрылася, асабліва пасля таго, як у лістападзе святар перажыў чарговы суд. У снежні а. Баляслаў зноў трапіў у шпіталь, адкуль ужо не вярнуўся. Памёр ён ад хваробы сэрца ў Целяханах 26 снежня 1940 году, і там быў пахаваны. Сям'я святара, слушна баючыся арышту, мусіла неўзабаве ўцякаць на Віленшчыну, на радзіму Марцыяны Пачопкі, а адтуль – у Польшчу, дзе нашчадкі айца Баляслава Пачопкі жывуць і сёння.



Парафія не надоўга "перажыла" свайго пароха. У верасні 1942 года ў выніку карнай аперацыі немцаў "Балотная ліхаманка Усход-Захад" чатыры вёскі, якія ўваходзілі ў склад бабровіцкай парафіі (Бабровічы, Вяда, Тупічыцы і Красніца) былі спаленыя разам з жыхарамі. Пасля вайны адрадзіліся толькі Бабровічы.



Нельга аднак сказаць, што уніяцтва ў Бабровічах знікла бяз следу. Вернікі грэка-каталіцкай парафіі ў Івацэвічах, якія ў рамках святкавання свайго парафіяльнага свята ў 2000 годзе здзейснілі выезд на месца душпастырскай працы айца Баляслава Пачопкі даведаліся, што памяць пра Унію жыве ў Бабровічах па сённяшні дзень. Нажаль, гэтая палеская вёска зараз вымірае, але большасць жыхароў, асабліва тых, хто здолеў выратавацца падчас трагедыі 1942 году выдатна памятае айца Баляслава Пачопку. Яны з гонарам узгадваюць, што іх хрысціў уніят Пачопка. Адзін з жыхароў як каштоўную рэліквію захоўвае знойдзены на месцы плябаніі крыж. Чарговыя паездкі гісторыкаў грэка-каталіцкай Царквы дазволілі сабраць цікавыя ўспаміны пра а. Баляслава Пачопку і бабровіцкую парафію.

Доўгі час немагчыма было знайсці магілу а. Баляслава Пачопкі. Вядома было, што пахаваны ён на каталіцкіх могілках у Целяханах, якія на сённяшні дзень амаль цалкам знішчаныя. Ніхто з мясцовых жыхароў не мог паказаць магілу былога пароха Бабровічаў. Аднак неўзабаве ў 2002 годзе ў Баровічы прыехаў адзін з мясцовых жыхароў, які доўгі час жыў у Севастопалі на Украіне. Ён і дапамог адшукаць месца пахавання святара, дзе ўвосень 2002 году быў усталяваны крыж, а ў 2004 годзе ў 120-ыя ўгодкі нараджэння святара – помнік-каплічка. І, нарэшце, у 2006 годзе Бабровічы наведала сям'я а. Баляслава Пачопкі – ягоныя ўнукі і праўнучка, якія захоўваюць памяць пра свайго слаўнага продка.

*а. Андрэй КРОТ,*
*Гродна,*
*святар Грэка-Каталіцкай Царквы*

# “Немец любіў гаспадара,

## Успаміны аб нямецкай акупацыі



Ля Целяханаў

***Сёння недаставткова даследаванай тэмай гісторыі нашага краю з’яўляецца перыяд першай сусветнай вайны 1914—1918 гадоў. Слаба асветленай праблемай з’яўляецца пытанне жыцця простых людзей падчас нямецкай акупацыі ў азначаны час. Таму важнай задачай даследчыкаў з’яўляецца рэстаўрацыя таго складанага перыяду ў гісторыі нашай Радзімы. У кантэксце гэтага вельмі актуальнымі з’яўляюцца ўспаміны непасрэдных удзельнікаў тых падзеяў. У дадзеным артыкуле выкладзены ўспаміны аб нямецкай акупацыі часоў першай сусветнай вайны, запісаныя А. Зайкам ад М.Ф.Шчурко.***

***Фотаздымкі часоў першай сусветнай вайны сабраў і ласкава прадаставіў для публікацыі Алесь Зайка.***

Як вядома, ў жніўні 1915 года пачалося германскае наступленне ў напрамку Коўна-Вільня-Менск. У верасні расійскія войскі пакінулі Вільню, Горадню, Ліду, Брэст, Пінск і інш. гарады Заходняй Беларусі. У кастрычніку 1915 года фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск-Паставы-Баранавічы-Пінск. Каля паловы тэрыторыі Беларусі апынулася пад нямецкай акупацыяй. Гэтая тэрыторыя нямецкімі ўладамі была аб’яўлена на ваенным становішчы, уводзіўся жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым. Акупанты праводзілі масавыя рэквізіцыі сельскагаспадарчай прадукцыі, вывозілі сыравіну (асабліваму рабаванню падвергліся лясы Белавежскай пушчы) і прамысловае абсталяванне ў Германію. Адступленне расійскіх войскаў суправаджалася масамі бежанцаў. Паводле дадзеных НКУС РСФСР, на сярэдзіну 1918 года ў Расіі жыло 2 292 тысячы бежанцаў з Беларусі. Асабліва шмат бежанцаў запоўнілі Брэст-Маскоўскую шашу, дзе ў ліпені 1915 года на ўчастку Кобрын-Баранавічы знаходзіліся 400 тысяч бежанцаў.

***Паводле Энцыклапедыі гісторыі Беларусі***
***падрыхтаваўПавел Дайлід***



Немцы ў вёсцы

Праз пяць дзён бежанцы ўсё ехалі і ехалі шашою, уцякалі ад немца. І нашыя запалянцы пачалі ўцякаць. Хто адзін з сям’ёю, але найболей сваякі ды кумы збіраліся. На вазах буды парo блялі. А наш бацька кажа: “Яшчэ паспеям, у мяне коні хуткія і воз добры, а ў іх што за вазы.” На шосты дзень бацька кажа: “Ну, ужэ сёні паедзям”. А тут, з Гарабінціка, з лесу, выйшлі нашы садаты, рускія. Бацька падышоў пад іх папытацца ехаць ці не. Усе людзі баяліся пад немцом застацца, казалі, што здзекі надто чыняць з жанок, а мужчын у катаргу бяруць. А гэтыя салдаты і не палохалі немцомі, і нехвалілі іх.

І вот тут пачалася страляніна. Мы, дзеці, бегаям па надворку і плачам, дзе бацька дзеўся. Прыйшоў ён аднекуль і кажа: “І адны, і другія гінулі: добраго не жджы, адно бяды. Хавайцеся ў схрон”. А бацька наш прахцікоўны, хітры быў чалавек. Па вечарах, каб ніхто ні бачыў, узяў і схрон зрабіў. На загуменні, у слівках, там яшчэ дзічка велькая расла. Яму выкапаў, дзерава паверх ямы наклаў, а зверху зямлёю прысыпаў. А лаз зрабіў ад дзічкі, там буліна расла. Ды туды кубелец з салом, да мукі, да солі, да адзежу маці панасіла. Як пажаром пойдзям, то з голаду памрэм.

Пазалазілі мы і сядзім. Страшно,



Выганашчы



Святая Воля



Працуем разам

# любіў парадок...”

## часоў першай сусветнай вайны

бо страляніна кругом. А тут бацько: “Забыўся коняй выпусціць, сяло загарыцца, то і коні згарацъ”. Прыціхло трохі. Хацеў бацько ўжо вылазіць, але Агата, старэйшая мая сястра, кажа: “Ты, тато, не ідзі, я пайду лепш выпушчу”. Пабегла, хутка назад прыбягая: “Татачко, наш жарабец параняны” – “Ой, маўчы, жаба, ты ведаяш. Ну як ён раняны, ды праз хлеў яшчэ”.

Але пабег бацько. І праўда, Святая Тройца, са сцягна кроў цячэ. Але нівелькая рана, ано шкуру задзело.

Яцо з хлява – а тут немцы ўжэ на надворку гергечуць. Адзін наставіў вінтоўку на бацька і кажа: “Рус, рус, ідзь до лясу, бо рускі цябе заб'е”. Пайшлі мы ў лес. Бацько будана паставіў. Цяпло было начаваць, бо тады натто цёплая восянь была. На трэці дзень прышлі ў сяло, але немяц у сваю хату нас ужэ ні пусціў, а ўсе 18 сямействоў, якія не выяхалі, пасяліў з аднаго канца сяла. Праўда, пасля мы жылі ў сваёй хаці.

Хто застаўся тут? Ёзіка Лосікаваго бацько, Андрэя Нямковаго бацько. Усяго 18 сямейств. Засталіся бяднейшыя, у каго не было каня добраго, альбо старыя, слабыя. А некаторыя пазаставаліся, бо шкадавалі дабро пакідаць, гаспадарку. Не пабаяліся і немца. Але хадавых мужчын немец у Германію пабраў. А нашаго бацько пакінулі. От, ужэ і не ведаю, чаму.

Пападушыліся мы той восяню. Паставаласё ўсё: і неабмалочанае збож'е, і картоплі не пакапаныя. Усё трэба было ўбраць: немцы застаўлялі. Праўда, і самы салдаты малацілі і картоплі канём выгорвалі.

А ўжэ на другую восянь бацько нагараў сабе поля, колькі сіл было.

Гадоў праз два немцы прывязлі сюды ў Заполье касілку, малацілку, вогіра племяннога, свіней пародзістых. Гэто хацелі, каб нашыя людзі разводзілі. Немец любіў гаспадара, любіў парадок. Калейку зрабілі з Няхачава да Гуты. Лес рэзалі і да сябе ў Германію вазілі.

Усіх чысто немец застаўляў рабіць. З Косава ні адзін жыд ні выяхаў ў Расею. То германяц застаўляў іх рабіць. Было, жыдоўкі выйдуць шпацыраваць на высокіх каблуках, немец за іх – і сена варочаць, а каторая ні ўмея, ён кіем падганяў.

Яшчэ памятаю, мы, дзеці, бегалі да немцоў на кухню. Прынясеш дроў бярэмя, і дасць кухар міску баланды і чарпак кавы. Адзін наш хлопяц быў усюды першы. Немцы бялілі канюшню. Ён пабег паглядзець. А немяц вапны як ліне, так усяго і заліў. Ён абцёрся, падышоў пад нас і давай нас клікаць каб паглядзець, як немяц канюшню беліць.

Мы ідзем, а ён ззаду нас. Мы глядзь у дзверы, а немяц нас пааблівaў вапнай і папраганяў. А той хлопяц рады, рагоча.

У 1919 годзі немцы паўцякалі. Але ўсё да сябе ў Германію забіралі, альбо людзям прадавалі.

Зразу прышлі рускія, бальшавікі, але крыху пабылі і зноў пайшлі. А ўжэ тады палякі прышлі. У 1920 – 1921 гадах нашыя людзі пачалі варочацца.

*Успаміны запісаў А.Ф.ЗАЙКА ў 1974 г.*
*Рэспандэнт Шчурко Марфа Захараўна, 1907 г. нар., жыхарка в. Заполле Івацэвіцкага раёна*



Івацэвічы



Немцы рамантуюць комін



Вясковы штаб



Вясковая ідылія



Свята

# ПІНШЧЫНА

## ДЗЕЙНАСЦЬ АНТЫСАВЕЦКІХ ПАРТЫЗАНАЎ

***Сёння тэма паваеннага антысавецкага, антыбальшавіцкага супраціву ў афіцыёзнай гісторыяграфіі не з'яўляецца пашыранай. Нягледзячы на гэта, існуе неабходнасць адсунуць ідэалагічныя межы і па-іншаму паглядзець на тое, што адбывалася ў Беларусі адразу пасля нямецкай акупацыі. Ці адбылося ў 1944 годзе вызваленне краіны? Так, але нельга забываць і на тое, што адзін таталітарызм замяніў другі, з усімі зыходзячымі адсюль наступствамі: калектывізацыяй, раскулачваннем, рэпрэсіямі, задушэннем усяго нацыянальнага.***



"Ворагамі народу" станавіліся не бандыты-крымінальнікі, а тыя хто меў нейкія іншыя перакананні, хто марыў годна жыць і не жадаў быць часткаю бяздушнага антычалавечага механізму, якім кіравала бальшавіцкая партыя. У такіх умовах ізноў пасля вайны беларускія лясы напаўняюцца тымі, хто выбіраў шлях змагання з савецкай уладай. Не выключэннем была і Піншчына, дзе акрамя ўласнабеларускіх антысавецкіх фармаванняў актыўна дзейнічала яшчэ і Украінская Паўстанцкая Армія – вайсковае аддзяленне Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў. Трэба адзначыць, што пасля вайны ў кожным раёне існаваўшай тады Пінскай вобласці для барацьбы з антысавецкімі партызанамі ствараліся спецыяльныя знішчальныя батальёны. Яны налічвалі ад 50 чалавек і фармаваліся з былога партыйна-партызанскага складу пад патранажам мясцовых аддзяленняў НКУС. Афіцыёзныя гісторыкі называюць антысавецкіх партызанаў таго часу "бандытамі". Але ці заўсёды чальцы знішчальных батальёнаў дзейнічалі ў адпаведнасці з нормамі заканадаўства? Напрыклад, у сакавіку 1945 года байцы знішчальнага батальёну ў Ганцавіцкім раёне Уфімцаў і Дрэнь пабілі шыбы ў вокнах селяніна, за што і былі звязненыя. Аднак "учитывая, что они осознали свою ошибку и проделали большую работу по вылавливанию дезертиров (выловили 43 дезертира)" ужо праз некалькі дзён гэтых байцоў батальёну выпусцілі на волю [Дзяржаўны Архіў Берасьцейскай вобласці, фонд 7581, вопіс 3, справа 90, аркуш 42]. Таму ня ўсё так проста…

У Дзяржаўным Архіве Берасцейскай вобласці знаходзіцца дакумент (фонд 7581, вопіс 3, справа 698, аркушы 32-35), які пралівае пэўнае святло на супрацьстаянне антысавецкіх партызанаў і савецкай улады на Піншчыне ў 1948 годзе. Трэба падкрэсліць, што час актыўнейшага супраціву савецкай уладзе пакуль ішоў на спад каб ізноў разгарэцца з новай сілаю падчас правядзення масавай калектывізацыі ў 1949 годзе. Для найлепшай ілюстрацыі прыводзім поўны змест таго дакументу, без скаротаў:

***Секретарю ЦК КП(б)Б т. Гусарову Н.И. Секретарь Пинского Обкома КП(б)Б П.Тетюшев***

В связи с проводимой партийными и советскими организациями работой по коллективизации сельского хозяйства участились случаи совершения терактов над советско-партийным активом, поджогов домов сельского актива и колхозов, ограбления и ряд других враждебных проявлений.

За последние 2 года было 227 случаев различного рода крупных бандитских проявлений, в результате чего убито и ранено по неполным данным 66 человек партийно-советского актива и работников МГБ и МВД.

Несмотря на то, что органами МГБ и МВД ликвидировано за 2 года 145 банд с общим количеством бандитов 1536 человек, однако террористические акты не сокращаются, а увеличиваются.

В настоящее время на территории области постоянно действуют 10 бандгрупп с общим количеством более 100 человек:

Банда "Украинской Повстанческой Армии" главаря "Волос" из 5 человек и бывшего главаря Бебко из 4 человек, действующие в южной и северной частях Ивановского района. В этом же районе действует банда Романовича из 8 человек.

Банда "УПА" "Олексы" из 5 человек, действующая в Пинском и Столинском районах.

Банда "УПА" Андрейковца из 5 человек в Давид-Городокском районе.

Банда "УПА" Гречко из 6 человек в Дрогичинском районе.

Банда Армии Крайовой "Вин" Корженевича из 6 человек в Логишинском и Пинском районах.

Банда Цуба Владимира из 14 человек, действующая в Ленинском, Лунинецком и Ганцевичском районах.

Банда местного формирования бывшего главаря "Штурхало" из 6 человек в южной части Ленинского, Лунинецком и северной части Давид-Городокского районов.

Все эти банды находят питательную среду у кулацко-националистических элементов области, которые оказывают им всякое содействие.

В Дрогичинском, Ивановском и других районах в массовом количестве распространяются антисоветские и оуновские листовки. Распространителями и организаторами являются кулаки, нацисты и сектанты, установившие связи с оуновским подпольем

Пинская область сильно засорена украинскими и белорусскими националистами, сек-





# АНТЫСАВЕЦКАЯ



## НА ПІНШЧЫНЕ Ў ПАВАЕННЫ ЧАС (1940-я гг.)



тантами, бывшими немецкими полицейскими и кулаками.

В настоящее время в области насчитывается около 700 кулацких хозяйств, 2081 семья родственников репрессированных органами МГБ, до 400 человек немецких ставленников и полицейских, более 200 семей украинских и белорусских националистов, до 600 семей родственников бандитов.

В течении 1948 года кулацко-националистическими элементами было совершено 100 с лишним проявлений, наиболее характерными из которых являются следующие:

28 июля в деревне Любань Ленинского района совершен налет на помещение сельского совета, где смертельно ранен заместитель председателя сельсовета т. Шевчик.

8 августа совершен налет на автомашину Лунинецкого районного отделения МВД, следовавшую в район, где ранен помощник начальника милиции т. Шаповалов и председатель сельского совета т. Пятница.

9 августа разгромлено помещение сельсовета в деревне Мохро Ивановского района.

13 сентября в деревне Лучи Лунинецкого района сожжен дом депутата сельсовета т. Бойко.

15 сентября в деревне Упирово Ивановского района совершен теракт над начальником райконторы связи т. Мотогуз, инспектором райсобеза т. Войтович и заместителем начальника Областного управления связи т. Ясинским.

16 сентября в деревне Жолкино Пинского района сожжен дом депутата сельского совета т. Боричевского и убита его жена.

25 сентября в деревне Малые Чучевичи Лунинецкого района совершен теракт над бригадиром колхоза т. Курак Антоном.

22 октября в деревне Будча Ганцевичского района совершен теракт над председателем сельского совета т. Егоровым.

25 октября в деревне Глинной Столинского района убиты член истребительной группы т. Пафичиц, хозяин дома т. Ярошевич и его жена.

27 октября в деревне Рухча Столинского района убит член истребительной группы т. Лемешевский.

31 октября в деревне Оснежичи Пинского района совершен теракт над председателем сельсовета, депутатом Верховного Совета БССР т. Полещук.

Исходя из всего изложенного выше, Пинский обком просит поставить вопрос перед ЦК ВКП(б) и Союзным правительством разрешить выселить из пределов области кулаков, родственников бандитов и бандпособников, украинских и белорусских националистов и немецких ставленников.

**1948 г.**

Як вынікае з гэтай дакладной, сакратар Пінскага абкама Цецюшаў просіць дазвол рэпрэсіраваць 4 тысячы сем'яў у існаваўшай тады Пінскай вобласці. Каб падлічыць агульную колькасць падлягаючых рэпрэсіям жыхароў Піншчыны, гэтую лічбу можна памножыць у некалькі разоў, бо сем'і ж складаліся не з аднаго чалавека.

У дакладной маюцца таксама канкрэтныя факты "бандыцкіх" праяваў на тэрыторыі Пінскай вобласці. Як бачым, усе гэтыя праявы (забойствы, напады, падпалы) былі скіраваныя супраць партыйна-савецкага актыву, тых людзей, якія усталёўвалі савецкую ўладу пасля выгнання немцаў. "Бандытамі" ў дакладной называюць людзей, якія сталі на шлях узброенага змагання з камуністычным таталітарызмам, які змяніў сабою таталітарызм фашысцкі. І далёка не заўсёды гэтыя змагары з бальшавізмам былі ў мінулым "нямецкімі паслугачамі". Вельмі часта гэта былі людзі, пакрыўджаныя на савецкую ўладу праз яе антычалавечую палітыку, прыкрытую прыгожымі лозунгамі. Бо нягледзячы на тое, што пры Сталіне "жить стало лучше, жить стало веселей", гітлераўскія канцлагеры замяніліся сталінскімі і напаўняць іх працягвалі намі – беларусамі…

***Павел ДАЙЛІД,***
***Івацэвічы, краязнаўца, публіцыст***










## Яўген Грыцкевіч:

# Каханьне, Радзіма...

### НЕЎЗГАДАНЫМ

**Ва ўласных сумневах народ заблукаў,
Стабільна квітнеючы амаль што сканаў.
Забытая мова, забыта мараль,
Забітая вера і зьнішчаны грааль.**

**Што вёў нашых продкаў да вечнае славы,
Нагадваў аб нацыі заўсёды з'яднанай.**

**А гэты народзе спакойна жыве,
"Капейку" імае й духоўна гніе.
І думае, быццам жыве і красуе,
Астатняе ўсё яго не хвалюе.**

**Дык, што ж мы нашчадкам сваім захаваем,
Калі ўласным маўчаньнем сябе пахаваем?**

**Толькі мной абраны іншы шлях, што вядзе ў кайданы,
Але не шкадую я, што стаў удзельнікам вайны!**

**Ў рэшце рэшт маё сумленьне, стане чыстым, як крышталь,
Нерашучасьць пераплаўлю ў волю, будзе цьвёрдаю, як сталь!**

**За што пакараньне мы гэтае маем?
Бо проста чужынцаў мы добра прымаем.
Такім ужо склаўся "Беларускі народ",
Яго талерантнасьць – яго і прыгнёт.**

**Чужыя парадкі нам роднымі сталі,
Маўляў, мы сваіх ніколі не малі.
Ўжо новы ёсьць звычай – "гарэлка ды біцца"
"Шчасьлівы Народзе" з замежжа ўсё возяць.
Адзін мае долю, астатнія ж просяць.**

**Дык колькі ж павінна зысьці пакаленьняў,
Каб зноў у наш край, прыйшло Адраджэньне?**

**Толькі жыць хлусьнёю, абы здатна, я так не магу!
Мо мяне адзін са ста пачуе, але я скажу.**

**Калі хочаш добра жыць Народзе, успомні, "Род наш" скуль пайшоў..,
Я трымаю сьцяг за Адраджэньне, на ім продкаў нашых кроў!**

**Рэфрэн**

**Мы – жаўнеры, не прызнаныя ні кім...
Нашае веры паламаныя крыжы,
Цягнем праз жахі, і пакутлівыя болі.
Вольныя птахі, што гадуюцца ў няволі.
Дзе жа тут праўда,
Ўжо ня ведае ніхто.
Што будзе заўтра?
Не сканаў бы мой Народ!**

### ЗВАРОТ

...Ведайце ж, як Вы любы майму сэрцу.
Усхваляваны я Вамі, як княгіняй чароўнай.
Душа мая прагна да Вашай імкнецца,
"Каменьчык" у грудзях ажывае раптоўна.

Дазвольце ў жыцьці з Вамі разам ісьці,
І думкі самотныя Вашы прыняць.
Падзякай будзе мне Ваш крыж пранясьці,
Сябе ўсяго Вам ахвяраваць.

Радкамі гэтымі шчырымі,
На вернасьць я Вам прысягаю.
І па-над астатнімі ўсімі,
Я з гонарам Вас услаўляю.

Жыцьцё Вы маё ў лепшы бок павярнулі,
І годна сьцярпелі мае ўсе заганы.
Можа й ня варты, але ж Вам сябе прапаную,
І Вас прашу быць маёю Каханай!

### Каханьне

Тое, што ў руках не патрымаеш,
Не пачуеш і ня ўбачыш...
Тое, што не прыйдзе, як чакаеш,
Калі прыйдзе – не пазнаеш...
Тое, ад чаго, зтрывогай, сэрца,
Мітусіцца так у грудзях...
Тое, што не прадаецца,
Анікому, ды ніяк!

### Любай

Ты паланіла маё сэрца,
Што да цябе з грудзёў імкнецца.
Я так табою ганаруся,
Ах, як згубіць цябе баюся.
Бо для мяне ты лепшая ў сьвеце,
Аб гэтым распавёў мне вецер,
Што пах валос тваіх узяў,
І да мяне вось завітаў,
Каб прасьпяваць мне на сьвітанку,
Пра маю любую Каханку.

### БЕЛАРУСЫ

**У росквіт цывілізацыі,
Мы згубілі сваю нацыю.
Усе навокал змагаліся,
Ну, а мы пахаваліся.
Час ішоў, мы стаялі,
А суседзі скакалі.
Мы казалі: -На што,
Трэба нам гэта ўсё?
Мы някепска жывем,
Але ж мы – ІСНУЕМ!
Зараз кажам "Ідзем,
У квітнеючы дзень..."
Але, дзе ж нашы вочы?!
Мы ў мінулае крочым!
Азірніцеся, людзі!
У якім жа мы брудзе!
Хто цяпер Беларус?
Толькі трактар, ды трус!
Я з табой размаўляю,
Толькі ты ўцякаеш.
Ты ня зьведаў наогул,
Сваю родную мову!
Ад мяне ўцячэш...
Ад сябе, ведай, не...**

# АРХЕОЛАГІ ПРОСЯЦЬ САДЗЕЙНІЧАННЯ

У Івацэвіцкім раёне, як і ва ўсёй Беларусі, маюцца археалагічныя помнікі розных эпох — ад каменнага веку да позняга сярэднявечча. Гэта старажытныя стаянкі і паселішчы, у тым ліку ўмацаваныя (гарадзішчы), а таксама грунтовыя могільнікі і курганы, якія ўяўляюць сабой круглыя паўсферычныя насыпы над рэшткамі памерлых і ўзводзіліся да XIII ст. Часам археалагічныя помнікі і асобныя старажытныя прадметы выяўляюцца пры розных гаспадарчых работах, напрыклад, пры будаўніцтве, пракладцы дарог або пры меліярацыі.

Як стала вядома, гэтай вясной (а мо і ў мінулым годзе) у адной з мясцінаў Івацэвіцкага раёна былі выяўлены вельмі цікавыя археалагічныя знаходкі—бронзавыя фібулы і бранзалеты з патоўшчанымі канцамі (**паказаныя на фота**). Фібулы—гэта ўпрыгожанні-шпількі для зашпільвання верхняга адзення ў старажытных народаў. Фібулы з Івацэвіцкага раёна адносяцца да тыпу так званых пальчатых, таму што заканчваюцца пяццю закругленымі галоўкамі, нагадваючымі пяць растапыраных пальцаў. Такія фібулы былі ва ўжытку ў VI-VII стагоддзях нашай эры, і былі найбольш распаўсюджаны ў Сярэднім Падняпроўі, у Крыме, на поўначы Балканскага паўвострава, у меншай ступені—у Верхнім Падняпроўі і паўднёва-ўсходняй Балтыі. На думку вучоных, у той час пальчатыя фібулы былі характэрным упрыгожаннем антаў—адной з груповак старажытных славян, насельніцтва якой напачатку жыло ў Сярэднім Падняпроўі, а потым засяліла і басейн ніжняга і сярэдняга Дуная. Бранзалеты з патоўшчанымі канцамі датуюцца прыблізна тым жа часам, што і пальчатыя фібулы. Па распаўсюджанню пальчатых фібул можна даследаваць складаную гісторыю ранніх славянскіх перасяленняў і пранікнення культурных уплываў.

На жаль, згаданыя рэчы з Івацэвіччыны



трапілі ў рукі аднаго ня вельмі сумленнага калекцыянера, які паводле матэрыялаў інтэрнэт-форуму (адкуль і ўзята фота), спрабаваў прадаць іх за межы Беларусі. Варта нагадаць, што згодна закону "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" усе знойдзеныя ў зямлі старажытныя рэчы адносяцца да рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў і з'яўляюцца ўласнасцю дзяржавы. Прысваенне такіх рэчаў прыватнай асобай ці тым больш вываз іх за межы Рэспублікі Беларусь катэгарычна забаронены Законам. Раскопкі археалагічных помнікаў, а таксама пошукі ўсіх старажытных прадметаў у зямлі ці на яе паверхні маюць права праводзіць толькі прафесійныя археолагі паводле спецыяльнага дазволу, які выдаецца Нацыянальнай Акадэміяй навук Беларусі. Будзе значнай стратай для нашай культуры і навукі, калі знойдзеныя фібулы і бранзалеты сапраўды прададзены за межы Беларусі. Асобныя нядобрасумленныя калекцыянеры, якія займаюцца такім гандлем, у пагоні за грашыма не задумваюцца, што сваімі дзеяннямі непапраўна збядняюць гістарычную спадчыну ўсяго народа, гэтак сама як сваіх дзяцей і ўнукаў.

Але пакуль яшчэ магчыма згаданыя рэчы з Івацэвіцкага раёна хаця б увесці ў навуковы абарот, каб даследчыкі маглі выкарыстаць інфармацыю пра знаходкі ў мэтах вывучэння старажытнай гісторыі нашых продкаў. Для гэтага трэба прынамсі даведацца, у якім канкрэтна месцы раёна знойдзены фібулы і бранзалеты. Вядома толькі, што гэтыя прадметы выяўлены дзесьці пад торфам. Магчыма, гэта было звязана з меліярацыйнымі работамі або з нарыхтоўкай торфакрошкі на ўгнаенне ці для вырабу брыкету. Таму прашу чытачоў, якім хоць штосьці вядома пра месца і абставіны выяўлення паказаных на фота фібулаў і бранзалетаў, неадкладна паведаміць пра гэта мне на мабільны тэлефон 110-49-91 (Velcom). Загадзя выказваю ўдзячнасць!

***Эдвард ЗАЙКОЎСКІ,***
***кандыдат гістарычных навук,***
***старшы навуковы супрацоўнік***
***Інстытута гісторыі***
***Нацыянальнай Акадэміі навук***
***(паводле "ГАЗЕТЫ ДЛЯ ВАС", Івацэвічы).***

# НЯСТОМНЫ ЗБІРАЛЬНІК

## Да 60-годдзя рупліўца краязнаўства Аляксандра Зайкі



Даследаванне гістарычнай адметнасці роднага краю стала найважнейшым захапленнем настаўніка з вёскі Заполля Івацэвіцкага раёна Аляксандра Зайкі. На працягу ўжо цэлых дзесяцігоддзяў, не шкадуючы сілаў, Аляксандр Фаміч вандруе па вёсках, збірае успаміны іх жыхароў, старанна занатоўвае мясцовую тапаніміку, гідраніміку, заўважае пэўныя асаблівасці гаворкі, збірае найцікавейшы краязнаўчы матэрыял. Аляксандр Зайка з'яўляецца аўтарытэтным дарадцам не толькі для "зялёных" аматараў гісторыі роднага краю, да ягоных парадаў звяртаюцца і навукоўцы, універсітэты, арганізацыі.

Шчырасць любові запалянскага настаўніка да роднай гісторыі, культуры, прыроды не можа не ўражваць. А ягонай энергічнасці ў спасцiжэнні аталяючага свету пазайздросціць любы малады чалавек.

Дык няхай жа служэнне Аляксандра Зайкі нашай Бацькаўшчыне паслужыць прыкладам для многіх іншых яе патрыётаў.

А Вам, паважаны спадар Аляксандр, дай Бог здароўя яшчэ на многія леты! Хай будуць споўненыя ўсе Вашыя мары і кожны новы дзень няхай дорыць Вам новае адкрыццё!

***Рэдакцыя "Рэха Берасцейшчыны",***
***удзячная грамадскасць рэгіёну***

# СПОРАЎСКІЯ ПОКАЗКІ

**Ёсць у свеце розныя месцы, якія асабліва вылучаюцца сваім народным гумарам. Можна ўзгадаць, напрыклад, славуты адэскі гумар, або гумар балгарскага горада Габрова. Але і ў нашым жа рэгіёне таксама ёсць мясцовасць, дзе людзі маюць больш дасціпныя жарты, чым іхнія суседзі. У дадзеным выпадку мы гаворым, зразумела ж, пра вёску Спорава Бярозаўскага раёна. Базавая адзінка спораўскага гумару—анекдот, праўда, па форме гэта не анекдот у нашым разуменні, а хутчэй байка, паказка. Кожныя 5 год у вёсцы Спорава праводзіцца берасцейскі абласны фэстываль народнага гумару "Спораўскія жарты", па-палеску: "Споровськыйі сміховыскы".**







*Валун ля Спорава—таксама прыклад мясцовага гумару*

Спораўца бяруць у салдаты.
На прыёмным пункце пытаюцца ў яго:
- Нацыянальнасць?
- Споравец.
- Пол?
- Быў гліняны, стаў драўляны.
- Ты што пляцеш?
- Кошыкі, венцяры.
- У цябе ў галаве што ёсць?
- Было, але ўчора маці дустам вытруціла.

*****

Неяк адразу пасля вайны па Споравe прайшла пагалоска, што ў каго ў вайну згарэла хата, то кватэры ў Маскве будуць даваць. Многія спораўцы папалілі свае хаты. На іх і да гэтага часу кажуць "масквічы".

*****

Як спораўцы у возеры рыбу ловяць?
Накідаюць у ваду журавін і назіраюць. Праглыне ягадзіну рыбіна, заплюшчыць вочы. Вядома, кіслая. Вось тут спораўцы і ловяць рыбу голымі рукамі.

*****

Спораўцы, як прыйдзе вясна, усе агароджу ладзяць вакол хаты. Чаму? Бо зімой на дровы паразбіраюць.

*****

Усякае высокае начальства любіць выступаць з высокіх трыбун. Аднаго разу спораўцы ўзялі ды і падпілавалі слупы ў высокай трыбуне. Узышло высокае начальства на яе, каб сказаць спораўцам палымяную прамову, ды грымнулася. З таго часу высокае начальства баіцца выступаць перад спораўцамі з палымянымі прамовамі.

*****

Адзін споравец ды ў другога спораўца купіў пеўня. Трэба завезці дамоў. Завялі трактар. Укінулі ў прычэп пеўня. Узяліся піць барыш. Трохлітровы слоік самагонкі і ляснуў. Жонка пачала клікаць мужавага пеўня Залатым.

*****

Споравец кажа пра сына:
- Як прыйдзе са скокаў і спакойна спіць – яго набілі. Прыйдзе, ляжа, варочаецца, кідаецца ў сне – ён набіў некага.

*****

У спораўцаў бусел – святая птушка. На свята, бывала, вядзе споравец за крыло бусла ў царкву. А тут кладка цераз ручай. То бусел па кладцы ідзе, а споравец – па вадзе.

*****

Спораўцы дамагліся, каб са Спорава да самага Берасця аўтобус хадзіў. Дамагчыся дамагліся, аднак здаралася, што пусты аўтобус адыходзіў з вёскі. Дык, каб не адмянялі маршруту, пачалі па чарзе ў горад ездзіць: сёння гэтыя тры хаты, заўтра – наступныя тры.

*****

Завітаў у Спорава вандроўны цырк. Цыркавы мядзведзь узяў ды ўцёк. Спораўцы яго забілі. Прыехаў следчы, сабраў людзей, кажа, што мядзведзь кручаны быў, і таму чалавеку, які яго забіў, сто рублёў дадуць. Выходзіць наперад адзін споравец і кажа: "Я біў, кум, сват, зяць таксама білі. Падумаў трохі і дадаў: "І брата таксама запішы!"

*****

У Споравe надзіва доўгія свінні. А гадуюць свіней спораўцы так. Убіваюць у хляве крукі, а да крукоў вяроўкай прывязваюць за заднія ногі свінню і штодня адсоўваюць ад свінога рыла карыта.

*****

- Калі спораўцам трэба сякеру ці яшчэ што павастрыць, дык яны тачыла на горку нясуць, пускаюць, бягуць за ім і вострацъ, што каму трэба, - распавядае споравец.
- У Споравe ж горкі няма! – здзіўляецца слухач.
- Бо вытапталі, бегаючы, - тлумачыць споравец.

*****

У Бярозе першы светлафор паставілі, а ён не працуе. Споравец кажа:
- Пакуль у Споравe не паставяць светлафора,той не загарыцца!

*****

У спораўца пытаюцца:
- Ты якую хату будзеш будаваць?
- Круглую.
- Чаму?!
- Каб з-за вугла не стукнулі.

*****

Унучка запрашае дзеда-спораўца да сябе ў горад на наваселле і просіць:
- Глядзі, дзеду, каб па па-гарадскому еў, відэльцам.
Сядзіць дзед за сталом, відэльцам есць. І захацелася яму пакаштаваць марынаванага маслячка. Накіраваў ён свой відэлец у талерку з грыбамі. А слізкі маслячок узяў і выпстрыкнуў з талеркі на стол, са стала – на падлогу. Ганяў, ганяў дзед-споравец таго маслячка відэльцам па падлозе, загнаў урэшце яго ў куток і кажа:
- Гад буду, а цябе ўсё роўна па-гарадскому з'ем!

***Показкі сабраў і прадаставіў да друку краязнавец Аляксандр ЗАЙКА, в. Заполле Івацэвіцкага раёна***

Рэха Берасцейшчыны. Гісторыка-культуралагічны бюлетэнь. № 1 жнівень 2008
- Распаўсюджваецца бясплатна
- Падпісана ў друк 25.08.2008 г.
- Папера афсетная, фармат А4
- Надрукавана на памнажальнай тэхніцы сябраў рэдакцыі

Рэдактар: Павел ДАЙЛІД
- Кантактныя тэлефоны: +37529 522-82-30, +37529 992-28-30
- E-mail: dajlid@mail.ru
- Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
- Пры перадруку матэрыялаў бюлетэню спасылкі на крыніцу абавязковая
- Наклад 299 асобнікаў

№ 1 ЖНІВЕНЬ 2008